Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная вул. № 1—2

Складка на год—2 зал., на паўгода—1 зал.
Адна кніжка — 50 гр.

Часапіс выходзіць раз у тры месяцы

Зьмест кніжкі 3 (12) „Калосься“

Бел. Друкарня ім. Фр. Скарыны, Вільня, Завальная вул. 1—1.

КАЛОСЬСЕ

БЕЛАРУСКІ ЛІТАРАТУРНА-НАВУКОВЫ ЧАСАПІС

Кніжка 3 (12) **1937 г.** **Год III**

Ня схіляць галавы!

Сонца кранула пальцамі струны шаўковыя раніцы.
Сярэбраным сьмехам у багне, у верасох зацьвіло.
І па сівых калосьсях пабрыў вецер згорбленым п'яніцай, —
рагаталі, у сьлед валацузе, пастушкі за сялом.

І глядзіш, і пытаеш вачыма вакол — і ня верыцца,
што у гэтым паветры—сінее маўклівае гора.—
Яшчэ раз, браты, клічу гартам грудзей з ім памерыцца —
ня схіляць галавы, ня схіляць у маўклівай пакоры!..

Прыйшлі з песьняй у сьвет мы, і гора пазналі з калыскай,
нам пялялі аб ім можа першыя матчыны словы,
з непагодай жыцьця парадніліся змалку так бліска, —
дык ці-ж нам апускаць прад шалеючай бурай галовы!

Болей гарту, далей каб ісьці па дарозе пачэснай!
Азірніся назад, — на шляхі барацьбы, на гады!
З нашых зёран, з бунтарна хвалюючай сьмелаю песьняй,
заквітнеў маладняк, ідзе зьмена байцоў маладых!

Сонца кранула пальцамі струны агністыя раніцы,
зазьвінелі яны, гімнам вузенькіх межаў палос,
толькі гартам стальным перамогі зьвяно з зьвяном вяжыцца
толькі сілай мазольнай рукі — лепшы выкуем лёс!

МІХАСЬ ВАСІЛЁК

Баброўня — май 1937.

Нарач
(Частка сёмая)

1

Я пайду, і мо' па росах,
ды па сьцежках адгалосаў,
эх, далонямі зьбяру
залацістую зару!

Пералескі, нівы, пейце!
Дзень іграе на жалейцы
і на сінім трысьніку,
і на залатым ражку.

Зрэбны пояс туга, туга,
бяры ў рукі пугу, пугу!
Нарачанскі сіні край,
гэй, на пасту выганяй!

Доўга пастыр на трубе
пералівае зару.
Скрыпам гамоняць вароты, асьверы.
Стада ляніва ідзе тошчых кароў пад гару
выганам стоптаным, шэрым.
Туліцца каля платоў жменя худых цялят,
сонна рыкаючы цягнуцца з заду;
гурбай авечкі плывуць, —
шэры узгорку пакат —
выган запрудзіла стада.
Толькі ўсё дрэмяць яшчэ лісьцем бярозы густым.
Неба,—як краскі на самазялёнцы.
Цягнецца з прасьніцаў—з хат столкамі пачасься дым
высака,
ціха, да сонца.

Сіньню вочы напіліся.
Хай наш хлеб гаркі ад гірсы,—
жыцьцё будзіцца між хваль,—
хтось пяе:Трансваль, Трансваль...

Абняло быльлё акопы,
толькі песьні не ахопіць —
нат' і сяньня боль глухі
разьліваюць пастухі.

Гора торбай з плеч зьвісае,
гора ў лапці абувае,
пяе песьні аб вясьне,
аб далёкай старане.

Эх, праз поле, поле, гоні
часам рэха толькі звоніць,
коціць ветрык галасы —
жытам — пацеркі расы...

Пуста на выгане зноў.
Змоўкла труба, ня гучыць.
Сьпяць яшчэ цені кудлатыя соснаў.
Голас чуваць маладзіц: гутараць мо' ідучы
вечна аб солі, аб кроснах.
Дзятламі ў косы дзяўбуць на перабой малаткі,
недзе, між стрэх саламяных, іржавых.
А на зялёных лугох звонка сьцябачкі, брускі
загаманілі у травах.
Вымыўся дзень у расе,
выцер яго ручніком
вецер пахучы ад сена і сьвежы.
Толькі вузкія шнуры,—не размахнуцца плячом.
Межы,
праклятыя
межы!

Поле — даль за чыстым полем,
край — над краем хмараў болей,
бор — ў бары сасоначкі,
даль — ў далі дарожанькі.

Гэй, з бяды ня гніся, браце!
Лепш за грудзі з доляй ўзяцца,
дзьмухнуць сьмела раз ці два...
. . . .

Можа мала гнуўся горбам,
можа шкода табе торбы,
лапці вечныя зьмяняць
на жалезнага каня?

На дыван палёў шырэйшы,
на пшанічны сноп цяжэйшы,
плач — на песьні і на сьмех,
і на сонца новых стрэх?!...

. . . .

Вецер калыша травой...
Мокры, мяккі мурог:
польны званочнік, ваўчыца, як воўна,
дзяцельнік белы, як сьнег, мята і чортапалох
сьцеліцца косамі роўна.
— Гэй, гэй! на бера-аг, сюды! —
з прыстані хтось крычыць,
быццам заспаўшае возера будзіць.
Коціцца травамі шум...
—Трэба мо там памагчы?..—
З вёскі... зьлятаюцца людзі.
Змоўкла на міг сенажаць...
Пырснула сонцам сталь
косаў на плечах спрацованых, шэрых.
Беглі, ішлі на цянькі.
Збуджаным шопатам хваль
клікала Нарач:
На бера-а-аг!..

2

Грышка

Зноў я на старых сьлядох!..
Запела раніца асьверамі, варотамі.
Хіба міну цікаючыся лог,
ярыной перапаўзу і агародамі...

. . . .

Пусьцеюць хаты.
Вёска дзесь на сенажаці
зьбірае золата зялёнае кароў.
Мо' і стары паплёўся на пакосы,
ці майструе каля невадоў...

Архіп

Грышка! А ты, браток, адкуль?

Грышка

Скажы, каб хто прыйшоў пад вечар.
Я пачакаю у Сымонавым таку...
Ды глядзі... Не гавары на вецер!...

Архіп

На беразе, ты чуеш?... нейкі гоман...

Грышка

Даведайся!...
Я сяньня з Гатавіч прыпоўз.
Там начаваў я у кладні саломы.
Але усюды шмат вартаўнікоў...
Учора, выспаныя лодкі за Прахорам,
ўсю ноч шукалі і толькі раніцай імглістай,
з другога берагу, ад бору,
з пустымі вёсламі вярнуліся у прыстань...
Ты што на гэта скажыш, а?...

. . . .

За саламянымі плячыма вёскі
на сонцы даль вазёраў расьцьвіла
ў зялёных, сініх і срабрыстых ўсплёсках.

— — — — —

Ўжо нераз і мяне адрывалі
ад сасонак і ціхіх бяроз,
ад вазёрных успененых хваляў,
ад сялянскіх дарог і палос.

Каласы мае град нераз выбіў
і на помач прыйсьці я ня мог,
але сяньня аб чорныя ськівы
адвастру новых песьняў нарог.

Перакіну праз плечы вясёлку
і вазьму ў рукі сонца—сяўню,
і зарой ураджаяў звонкіх
напаю вочы сінія дню.

Зашумяць пераліўна узгоркі
на іржышчах разьвеяўшы сум;
шчасьце яснае—поўначы зорку
на зажынкі ў руках прынясу.

Вечарамі, пакуль не сьцямнее,
загляджуся ў бязьмежную шыр.
Рэхам песьні адходзячы жнеі
будуць доўга шукаць спарышы...

3

Солтыс

Братцы, разыходзіцца!
Зьбірацца забаронена!

. . . .

Ды цішэй!
Бяз шуму, бяз гоману!
Ну што, ня бачылі? — ўтапіўся чалавек...

Першы рыбак

. . . .

Утопленік,глядзі.Рызман—на лаце лата...
Кашуля наша зрэбная ў яго.

Другі рыбак

Гэта ня з летнікаў, а нехта з нашых...

Солтыс

Пагнаў яго тапіцца нейкі чорт
і замяшаць нам вадзяную кашу!

Трэці рыбак

Перавярнеце тварам!

Архіп

Ня можа быць!... Прахор?...

Усе

Прахор...

На шэры брук галоў
лягло цяжкое восень-гора,
лягло на плечы рыбакоў,
на межы
на палосы, на вазёры...

. . . .

Эх, выпляснула Нарач з залатога дна
нямала сьлёз на бераг польны!...

Солтыс

Не, братцы, лепш не чапайце, не закон!

. . . .

Відаць ранены, ды яшчэ...арыштованы мо ён.
Ты ня бунтуй, Архіп!...
Тфу!... чэрці, а ня людзі!

Асьцярожна папажылі на сярмягу труп.
— Эх, і выбраў час — у самую работу!
— Пэўна яго вынясла рана, пад зару... —
Шэпчаць бабы: удава... сіроты...
Ззаду нехта ўсхліпнуў...
З далі падняў рой каласоў на полі вецер сьвежы.
Памалу рыбака, аратага загонамі нясьлі
праз выплыўшыя ячмяні, праз межы.
Выган. Спаткалі дзеці — пастухі.
—Бацьку твайго нясуць, Дзямітка!...—
Стаіць хлапчук год сем, як пугаў'ё сухі.
Тлум, дарога — дзьве сухія віткі.
Глядзіць...
Далёка на пяшчаным горбе,
над жытам хмары белыя заснулі.
Здаецца хлеб палудзенны у торбе,
ці мо' вузлом абора муліць...
Бацька...
Мо' затрымаць ці крыкнуць...
Таюць тлуму плечы за гарой,
як хмара градавая, скасіўшы сонца, нікнуць...
Стаіць пастух,
а вочы наліваюцца імглой...

4

На верацёнах залатых паркану
зара сінеючым зьвіваецца матком.
У хаце шэра...
Ценямі зьмярканьня
лажыцца ноч пад лавай, за палком.

Грышка

. . . .

Цяпер хоць пару дзён каб трохі адпачыць.
Хутчэй пакінуць трэба край азёрны.
Перапаўзём заставы неяк у начы,
пайдзём на Крывічы, ці на Заворнач...

Тацяна

Але ня варта больш рызыкаваць.
Пашто нам без пары галовы класьці?
Цябе і так магло ужо спаткаць
няраз ні два Прахора шчасьце...
Мо' бесьпячней было-б адседзіць...
. . . .

Грышка

. . . .
Ды часу хопе легчы пад парканам.
. . . .
Што-ж, Кагарка, маўчыш? Скажы!

Тацяна

Не! не! Мяне не зразумееў ты,
зусім на іншае ты поле перабег.
Я гавару пра восень, ты — пра лета...
Ці-ж я ня цешуся, што ўбачыла цябе?
Але падумай добра, сам падумай!
Магло нат здарыцца яшчэ і горш.
І так ня змые Нарач з вёсак суму,
не закалышаць яго нівы, бор. —

З далі, дзе неба з возерам зьлілося,
прыплыла песьня, і недзе за сялом
ўблытаўшыся у соннае калосьсе
заснула на мяжы сярод палос. —

Цяпер ня пойдзеш, адпачнеш, загоіш
ўсе раны, што не пераслалі ныць,
а посьле можаш нашыя загоны
пакінуць нат' — калі і не забыць.

Грышка

Ты крокі чуеш нейчыя за хатай?...

Тацяна

Тут ня прыйдуць... І час ўжо не такі...
Гэта ідуць зьмяняць начную варту
на бераг нарачанскі рыбакі.

У ступу хаты ціха, ціха месяц
спусьціў бараньня крывы рог,
з прасеяных на сіце зораў месіць
срабрыстай раніцы пірог....

Вецер з ніваў ацяжэўшых, цёлных,
што пасуцца дзесь пад сасьняком,
у азёр дайніцу з перазвонам
лье і лье
сівое малако.
Зорны шлях даўгою качаргою
на азёр сінеючы абрус
і на трысьцё, што дрэміць над вадою,
выграбае
з попелу зару.

5

Прышлі усе вёскі —
аж хата трашчэла ад плечаў.
Пра хлеб, пра палоў гаварылі баторынскія рыбакі,
ды бабы ў кутках спакойна шапталі аб нечым;
дзеці спрачаліся ціха
на згорбленай печы
дзелючы з раньніх зажынак бяду — куракі.

— Як-жа у вас сенакос?...
— Выгрызла сонцам засуха...
Цяжка пражыць... Шнуры шырынёй з пугаўё...
— Трэба далей Нарач,
Мястра
з Баторыным рухаць...—
Моўкнуць на міг галасы,звоняць дакучліва мухі.
Гутарыць моладзь у сенях пра маладое сваё.

З плечаў старых абразоў
зьвісае над лавай вясёлкай
вышыты, пэўна дзявочымі днямі, ручнік.
Ціха. На лаве у зрэбнай кашулі з іголкі
сьпіць гаспадар на сярэбраных стружачных столках,
нават яго не разбудзіць Нарач,
сьлёзы і крык...

— ...А ў якую-ж ты дарожаньку
адыходзіш ад нас, родненькі?
А куды-ж ты пасьвяточнаму,
сівы голуб, выбіраешся?
Аднэй сьцежкай цябе выправім,—
ды адкуль, скажы, спаткаць цябе?
Ці ад берагу азёрнага?
Можа ў полі з поля чыстага?
Можа летам летнім вечарам,
як зары цьвет асыпаецца?

Мо' вясной, калі зязюленька
закукуе ціхай раніцай?.. —

— Эх, баба! разсеіць здароўе
сьлязамі ды плачам...
—Што гэта паможа? чуваць па куткох галасы.—
Ад гора бароняцца людзі іначай...
Адно толькі долю сваю прагалосіць, праплачыць...
Праз пару гадоў памагаць будзе сын...
— А поп за хаўтуры загнуў.
Бяз грошаў ня хоча маліцца.
Кажа, бунтаўшчыка зусім не хачу і хаваць.
Адкуль яны грошы!..
Як рэшата хата сьвіціцца.
Аднэй крупіны ня вылавіш ложкаю ў місцы.
І так яшчэ як гаспадарыць будзе ўдава!

—Бяз пацер зямля на вайне прынімала. Дык прыме,
як брата, сяўца, пад сасною свайго.
Памоліцца Нарач дыхнуўшы грудзямі сівымі...
Успомніць калосьсе аратага імя...

Шопат ліецца цяжкой,
валавянай тугой. —

— Што-ж пайшоў ад нас дарогай невядомаю
і пакінуў нас — сіротаў няпрытуленых.
Ў хаце сьлёзаў тоні горкія і цёмныя,
падвалокі як з палову гора поўныя...
Паплывуць чаўны рыбацкія як некалі,
наш—на жвіры сьлёз,
на беразе застанецца,
бы крыло памёршай ў буру белай кагаркі,
што шукала долі ветрам расьцярушанай...
Не пацешаць ўжо ніколі птушкі з выраю,
не пачуем болей слова твайго шчырага,
не пасьвеціць на нас сонейка гарачае,
не павеюць ветры рыбныя, вазёрныя...
Будзем рана мы хадзіць зарой па беразе,
рыбака свайго, аратага шукаючы,
заімгляцца вочы ясныя, як восеньню,
на азёры,
на палосы
паглядаючы... —

— Хай не бядуе:
блізкія суседзі памогуць...
—Не заракайся вастрогу і торбы жабрацкай насіць...

З палову заўсёды частку Прахораву могуць
узяць удава і Тацяна—для бацькі старога...
Па сьвеце ня пусьцім ласкі панскай прасіць. —

—Ды устань, падыміся, паглядзі, наш родненькі,
колькі людцаў каля цябе пазьбіралася!
Як ня ў беднага, а ў багатага на вясельлейка.
Толькі ўсе маўчаць, ні пяе ніхто і ня цешыцца.
Хату новую, габляваную далі табе,
вокны відныя, страха новая, сасновая,
не закапае
шэрай восеньню, дажджліваю,
не падзьме ў парог вецер белымі завеямі!—

Шэрымі шышкамі зьвісьлі на грудзі галовы.
Шмат хто выйшаў насунуўшы шапку на лоб.
Ў горле зьлівалася камнем кожнае слова,
секла па твары дожджам гарачым, сталёвым.
Гора, здавалася, вочы,
хату
і Нарач перарасло...—

—Ды чаму-ж закрыў бяз часу свае вочы ты?
Хоць яшчэ раз глянь вачыма яснымі.
Хоць адно пакінь сіротам слова цёплае,
ды скажы, як жыць на сьвеце няпрытуленым?
Паглядзі, — прыйшлі блізкія і знаёмыя
нарачанцы, мястраўцы, баторынцы.
Папрасі іх, каб за дзетак заступіліся,
каб глуміцца не далі над імі беднымі.
Папрасі, — каб наша гора палыновае,
нашу крыўду сьлязьмі горкімі абмытую,
восень жоўтымі лістамі не завеіла, —
каб яны яе ніколі не забыліся!.. —

Дрогнула хата плячыма,
як човен удараны крыгай.
. . . .
Шмат ў каго вочы імгляцца адлігай.
. . . .
Труна паплыла на плечах праз выган...
Плакалі дзесь над памежкам
шэры канюх, кулікі...

6

Курган на кургане
і крушні сівога каменьня,
ды рукі сухія узьняўшы застылі крыжы.
Высяцца гордыя сосны
раськінуўшы струнныя цені—
над тымі, што болей ня ўстануць, ня вернуцца жыць.
Памалу з магільніку
ціха расходзяцца людзі.
Сьлязамі ня збудзіш ні нашых, ні брацкіх магіл!...
А сонца ўсё паліць, часамі жар вецер астудзіць
на ўсходзе ўздымаючы
хмараў чырвоных стагі.

Ды цяжка, бывае, падняцца і выпрастаць плечы,
як з вочаў заціснутых
сыпяцца сьлёзы рабінай...
Дзьме наганяючы ценяў чорныя пер'я вецер,
коціцца сонца у возера,
лістам сарваным з асіны.

Панура шуміць і грыміць над апусьцеўшым гасьцінцам.
Хмары разьвеялі грываў
чорныя столкі,
пугі маланак сьвішчаць агнём навальніцы,
грому шарахаўкі звоняць
дзесь пад дугою вясёлкі.

Гнуцца да самай зямлі
шумна бярозы і сосны.
Раз і яшчэ раз ударыў вецер шалёны, сьляпы,
з сіняй возера міскі
на бераг хвалямі плёснуў,
крыльлямі ўзьняўшы пену сівую і пыл.
Раптам змоўкла. Ціха...
Толькі вячэрнюю ціну
рве Нарач пенай-зубамі цягнучы ў тоні, на дно.
Недзе крычаць пастухі: дамоў... дамоў скаціну!..
Сыпнуў на плечы худыя загонаў
поўнымі жменямі дождж...
— — — — — — — — — — — —

Першы рыбак

Хутка пачнуць на вазёры качкі зьлятацца,
а нашы яшчэ падвалокі ловяць на беразе вецер.
Не зарабіў у рубашцы, дык не заробіш ў сярмяжцы.
Лісьцямі восень напоўніць аруды у клецях.

Архіп

Каркаць ня варта...
. . . .

Другі рыбак

Цёпла і ціха...
На рыбу—начамі туманы бялеюць.

Грышка

Хацеў-бы я моцна пабыць яшчэ з вамі. —
Грудзьмі, разам з вамі, спаткаць...
і сонца, што ўстане, і дзень над палямі,
што хутка зарой загарыцца.

Архіп

Прымуць, як госьця, вазёры...
Не забывай нас!
А мы будзем сеткі рыбацкія латаць...
Ды мо' і сам, на дарогах разстайных,
спаткаеш нярaз нарачанскі наш лапаць.
Што-ж, разьвітаемся...
Сяньня туманам,
як мокрай мілтай, сее месяц з латкі.
Да Мядзела, мо' і далей, хай правядзе Тацяна,
а там бязпечна—на Баклаі, на Кладкі...

Атава маладая заглушае крокі...
Аўсяным сном палосы яравыя дрэмяць.
Ў імгле зблудзіла сіцца адзінока,
ды зораў дзе-нідзе льняное ўсходзіць семя...

Грышка

Тацяна!
Жыцьцё маё ідзе другой дарогай...
Прайдуць даўжэйшыя гады ад успамінаў.
Змые Нарач з пяску берагавога
дні пражытыя прылівам сінім;
трысьцём іх пазаносе вецер сьвежы...
Не, Кагарка, я не магу прасіць, мяне ты
каб над азёрамі чакала з дальніх сьцежак.
Нярaз можа засьне снапамі ў гумнах лета. —
Спаткаеш у жыцьці людзей мо' добрых
і пражыла-б цішэй, спакойна...
Яшчэ ў мяне дзён бяспрытульных торба,
і шмат няпройдзеных дарогаў польных....

Тацяна

Вось і Мядзела...
На Кладках будзеш рана...

З садоў, як з чорнай рамы,
над шэрым возерам туману
касьцёл падняўся белымі мурамі,
застыў як хваляй выгнаная крыга.
Сьпіць бераг Мястра выгнуўшыся лукам.
Палой сярмяжнай даль імгла закрыла...
Спаткаліся ў апошнім разьвітаньні рукі,
і вочы — дзьве зары кароткай
летняй ночы.

Грышка

Пайду... Чакаць ты будзеш?
Усё будзе добра... Ну, ўсьмяхніся!..

Словы цёплыя рваліся праз грудзі, —
на сум разстаньня сонечна ліліся.

Тацяна

Будзь асьцярожным!..

. . . .

Вярніся, — пад вясну, як прылятае вырай... —

Пайшоў...
Памалу крокі змоўклі, —
засыпаліся мокрым, сінім жвірам.

— Грышка!..

Мо' што забылася сказаць, ці падзяліцца
надзеяй, сумам нахлынуўшым з палосаў?..
Ціха ..
Далёка, за гасьцінцам
засумавалі дзесь начлежнай песьні адгалосы:
..."адна мамка старэнькая успомніла мяне"...—
Чуваць у голасе туга палос, іржышч.
За доляй нехта ў полі затужыў...—
..."а дзе-ж мая гаротніца у чужой старане"...
І голас плыў глыбокі, цёплы пачуцьцём,
і таіў сум,—руччы плылі па межах, тропах.
Здаецца пеража тае жыцьцё
хтось пераліць хацеў у ветру шопат.

7

Солтыс

Братцы! Зьбірацца я забараняю.
Сказаў раз і досыць: людзі вы—не сяньнікі!
Разыходзіцца па хатах!
Хай усе паадкладаюць
назад шасты, і пешні і калкі!

Першы рыбак

За колькі ты узяўся пець нам песьні?
Чулі не такіх мы салаўёў!..

. . . .

Солтыс

Вось і Іван скажа, і пан стражнік,
што сілай так ня возьміце азёр,
на'т берагу вам не дадуць паўсажня!
Ды які вас падбухторыў чорт!?
Сяньня ня час!
Адложым справу.
Згодна, палюбоўна,
да канца зьвядзём.
Возера не адплыве ад нас сялявай!

Другі рыбак

І так...

. . . .

Архіп

Стой!
За рана ты нас адпяваеш!
Гадзіцца радзіш.
Але з кім?

. . . .

Шырака з плечаў рыжых узгоркаў
на бераг азёрны ідуць рыбакі.
Сонна спаўзлі з пяшчанага скату лодкі
абмыўшыся пенай і ветрам срабрыста-мяккім.
Хваля адна падпаўзла, другая прыйшла ей на помач,
як быццам крылатыя лодкі хацела у даль заманіць,
дзе сінім настольнікам Нарач заслала поўнач
і поўдзень, і захад з усходам да сініх граніц.
Плывуць, разыходзяцца шырэй...
Хай вецер сьмяецца і звоніць
медзьдзю шарахавак, звоніць на вёслах, як гром!

— Мы вылавім сонца
у паднебных прасторах
і ў тонях!—
Топяцца сеткі
ў жывое
азёр
серабро.

ЭПІЛЁГ

За шыбамі тлеюць у попеле сінія зоры.
Мерзнуць ад сьцюжы апухшыя пальцы, баляць.
Ведаю, песьні, вам хочацца струнных разораў,
шолаху лесу зялёнага, шуму азёраў, —
сьніцца няраз вам шчасьлівая наша зямля.

Будзе ўсё гэта... Сталёвым нарогам падымем
новыя дні, залатых ураджаяў зару
зьбяром у снапыматораў рукамі стальнымі,
і вёснамі будзе цьвісьці маладымі,
вясёлкамі песьняў мая Беларусь!..

А сяньня ідзіце, ў народ мой ўлівайцеся!....
Хай звоніць у кроках ваш кожны акорд, пераліў!
Вы гнуцца ня ўмелі . . . .
ня пілі з балотных крыніцаў атруты,
ня поўзалі вы і ня спалі, як хмары плылі.

А сяньня ідзіце у шэрыя хаты, пад стрэхі!
Пазнаюць вас там па глыбокіх шрамох,
па чорных мазолях, па голасе рэха,
як сонечныя загарайцеся вехі
на новых вяршынах цяжкіх перамог!

А сяньня ідзіце між родных загонаў!
Шмат вочаў знаёмых спаткаеце вы.
Засьцеляць вам нівы узорны настольнік,
як прыдзеце ў госьці ў дзень заўтрашні . . . .
ці з славай памёршых ці з славай жывых.

І ноч вось праходзе... За шыбамі вецер...
За сына дзесь моліцца матка цяпер...
А я хачу сонца засеяць па сьвеце
і ворагам кінуць у вочы з пад сэрца
апырсканы кроўю гарачаю верш!

Вось раніца ціха лягла на падлогу...
Хоць хлеба няма, але песьні бяру, —
разсеіць іх трэба па родных разлогах.
І заўтра на струнах — на новых дарогах
прыдзецца яшчэ апяваць Беларусь!..

Вільня, 3.II.1937г. *МАКСІМ ТАНК*

Ааза стрэхаў

Стаяў каля вакна і маркотнымі вачыма лашчыў далёкія ўзгоркі. Серабрыстыя хвалі збожжа плаўна нясьліся ўдаль і гінулі зьліваючыся з бледна-сінім небасхілам. За кучкамі параськіданых хатаў калясістыя дубы шумелі казку лета. Паволі перавёў вочы на густыя кусты церняў. Шукаў на іх сонечнае белі вясны. Успомніў раніцы маю, калі таксама, як цяпер, стаяў каля вакна і бачыў белую вясну. Нязнаная туга сьціскала сэрца. Успомніў горад шумна-гучны. Там блізкія змагаюцца за права існаваньня. Мурашкамі ваююць з цемраю жыцьця. Нясуць лучыву сьвету ў глухія куткі вёсак. І падаюць, устаюць, ізноў паўзуць да мэты. А ён што робіць? Ці праца высілку яго зьліваецца з агульным высілкам народу? І паказалася яму, што за вакном вішнёвы сад у шуме ветру сярдзіта папракаў яго за слабасьць веры. Упалі вочы. Пачуў хвіліну сумнага настрою. Ён ведаў: сум і радасьць, досьціг і няўдача, вера ў будучыню і мляўкія сумлевы — пачародна залівалі аднатонныя дні яго жыцьця. Паволі западаў у бяздумную драмоту.

Збудзіў яго вясёлы крык дзяцей. Пліснуў гоман у сьценах клясы. Сабраўшыся чакалі вучыцеля.

— Вось абавязак, праца і падзяка! — пачуў ён голас унутры. —

Ужо пара! — шапнуў схаваўшыся з вакна.

Выйшаў да дзяцей. Вясёлыя, на перабой, яны віталі вучыцеля. І ён з усьмешкаю адказваў ім. Хвіліна ціхага маўчаньня. Пасьля пачатак лекцыі. Пытаньні простыя й адказы параськідаў сярод дзяцей. Іх вочкі пачалі запаляцца зацікаўленьнем. Кожнае, на перабой, старалася браць голас. Вучыцель чуўся ўладаром. Быў моцны ў сваёй місіі...

Раптам — усе зьвярнуліся да вакна і за вакном пабачылі інспэктара. Вучыцель страпянуўся. Пачуўся, як барэц перад арэнай.

— Ці вораг, ці прыяцель? — мільгнула мысьль, калі вітаў яго ў парозе. Працягнуў халадную руку, а той палез вачыма ў нутро. Вучыцель быў сабой. Зьбіраў па клясе расьцярушаную ўвагу вучняў. Згарнуўшы мыслі ўсіх дзяцей у адно зьвяно, ён забаўляўся пераліваьм звонкіх галасоў. Лекцыя мэтодыкай блішчэла. Госьць моўчкі за сталом лавіў яе цені. Ня мог знайсьці прычэпкі... А галасы дзяцей раіліся ў клясе. Хацелі ўсе чытаць, адказваць на пытаньні.

* * *

У вучыцельскім пакоі. Інспэктар праглядае крытычныя заўвагі. Вучыцель выйшаў да дзяцей.

— Чаму мы не баяліся інспэктара? — даюць вучыцелю пытаньне.

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

— Чаго-ж яго баяцца? — то-ж госьць наш, дзеці.

— А летась мы баяліся, дрыжалі, як быў, і пані наша ў страху ключы ад шафы пахавала.

— Дзе?

— Пад шафу.

Вучыцель усьміхаўся. Ён ведаў добра, чаму дзяцей пакінуў страх. Вярнуўся ў пакой.

— Вы ўзялі шмат праграмы. Ня трэба так! — спаткаў яго інспэктар. — У нас, у горадзе, ня так...

— Тут вёска. Яны за год павінны ўзяць усё тое, што ў горадзе бяруць гадамі... За год ім позна будзе...

— Так, так, я не пярэчу, а ўсё-ж вы самавольна... — цадзіў інспэктар на адходзе.

* * *

Сьвісток паравозу жаласьліва замёр у гарачым паветры. Рытмічным стукам цягнік адмяраў кілямэтры. Узгоркі маршам гарбатых дзядоў праходзяць прад вачыма. На станцыі галосяць хлапчукі: „гарбата, памаранчы"... Мурашкамі-людзі цягаюцца з клумкамі. А ён угнезьдзіўся ў далёкую дарогу. Думкай блукаўся па школе. У вушох зьвінеў дзіцячы сьмех. Хацелася вярнуцца, бо чуў, што больш ня будзе там...

* * *

Па вуліцах ідуць парамі вучні. Іх галасы хвалююць над мурамі. Паходамі кіруюць пэдагогі. Ідуць. І ён люнатыкам ідзе. Глядзіць, як упыр, на дзяцей. І бачыць толькі іх. У чуе толькі іх. Вучыцель — сірата. Паходы ў школах пазьнікалі, а ён стаяў адзін, з любоўю ў сэрцы да дзяцей. Туга душыла грудзі. Хацелася кудысьці ў даль. І ён пайшоў...

У твар дыхнула восень. Ціха-шэрыя палі шапталі з ветрам пра зіму. Нізкія хмары попелам сыпаліся на вёску. Пад стрэхамі таілася цемра...

У грудзёх яго захвалявала сіла, а вочы радасьцю гарэлі: не заблудзіў у лябірынце думак..

Іван Камель

Вільня, верасень 1936.

---

* * *

Лясы, лясы і пералескі,
вясёлы шум зялёных ніў, —
ў грудзёх цьвіціць красы усьмешка
і ціхай радасьці прыліў.

Краіна сьветлых сонцавеяў,
ірдзістых раніц, срыбных рос,
дзе гладзь люстраная сінее,
вазёр і рэк шырокі плёс.

Люблю твой чар, твае настроі,
прастор і шыр, і шолах траў,
і сэрца шчырае, простое,
табе у песьнях ўсё аддам.

Што боль пякучых кпін... і гора,
калі крынічыш сэрца ты?
Дзе страшна так было учора, —
там хутка вырастуць цьвяты!

Ня мне, паэту тваіх вёсак,
карміцца смутку лебядой,
калі так лёгка сум расплёскаць
і боль душы гасіць — красой.

Вісяты, 10.VI.37.

---

* * *

Я шукаў цябе заўсёды,
я чакаў цябе гады, —
ты прыйшла, як дзень пагодні,
як цьвілі усе сады.

Сад цьвіцеў... і ты цьвіцела
краскай сонца і вясны.
Я стаяў такім нясьмелым, —
бачыў — краскі, сінь і сны.

Міхась Машара

Н о ч

Ад зораў — аж бела...
З паднебнай ральлі
ноч пільна, ноч сьмела
глядзіць у палі.
Лільлёва й зялёна
дыміць сенажаць,
гдзе мокрым пласконьнем
туманы ляжаць.
Разбуджаны месяц
вісіць на гальлі,
а пальцы, ўсе дзесяць,
камлі абнялі.
Так моцна, так цесна,
што сьцішаны ўздох
праз нарасьлі плесьні
пайшоў па сукох.
Парваў, раскалыхаў
бель месячных кол...
і зноў стала ціха
ў палёх навакол.
Боль, жалі — сапраўды
зьляцелі гдзесь проч.
Ілгуць усе праўды,
адна праўда — ноч!

Вугорскія скрыпкі

З-за шыбаў ноч глядзіць вільготнай, жоўтай мглою,
ў жмутох лісьця чагось шукае шамятліва,
і не знайшоўшы—дзьме ў каштаны песьняй злою,
плюе на плямы шыб дажджом—сьліною шклівай.
Пад стольлю радыё, уецца цьмой—музыкай,
дрыжыць на шкле вакон, як звонку дождж і восень,
вугорскіх скрыпкаў плач гарачы, яркі, дзікі.
Так нівы на паўдні ўначы шумяць калосьсем,
так пуштай залатой імкнецца навальніца,
так рэжуць шэрасьць хмар разгульныя грымоты
й зялёны, шумны дождж прадзе ў паветры ніці.
А скрыпкі ўсё пяюць, гарачай, шчырай нотай..
Высокі, сьветлы тон пярэчыць дню пустому,
вядзе мяне з жыцьця па залатым праменьні,
і плача, сьмяючысь, і пнецца строма, строма,
зьмяніўшы ноч і дождж у сонца зіхаценьне.

Натальля Арсеньнева

В а й н о ю*)

Дзесьці ў сенцах скавыталі парасяты да рохкала старая сьвіньня, поркаючы лычом у дзьверы. Дзьверы рыпелі на завесах, соўдалася ўзад і ўперад старая закрутка да ціха дзынкала кружолка бляшанка на лямпе, заіржаўленая, замушаная, якая вісела на дроце, абверчаным паліналай рознакаляровай паперай.

— То-ж чамярыца на іх, вымерхаваліся ўжо, дзе ты на іх набярэшся... Дзьверы і тыя сарвуць...

І Настуля, падаткнуўшы падол старога андарака, завіхалася ля печы, дзе парыліся чыгуны бульбы. Большы вот для сьвіньні, для парасят, для цялушкі крыху, а меншы для сябе — паронкі. Дзеці коўзаліся на падлозе ў мыцельніку. Старэйшы кідаў у цэбар з памыямі трэскі—плыты ганяў, дыназаляў Настулі, што раз цярэбячы яе за спадніцу!

— Мам, а мам...

— Чаго ўжо табе? Ах, каб на цябе немач, усю кашулю ўмачыў, цячэ аж...

— Дай клубок, мамка, плыты вязаць...

— Вот я ўжо як аперажу цябе матузом, дык ты ў мяне будзеш ляжаць як зьвязаны...

— Дай, мамка, нітку...

— Адчапіся назола, дай вот сьнеданьне прыгатую, — і Настуля хапала малога на рукі, і трымаючы яго пад пахай, выкручвала кашулю, і даўшы добрага шлепанца, пускала на падлогу. Меншая вазілася з кацянятамі, ціскала іх, цягала за хвост, карміла бульбінай. Тыя мяўкалі жаласна ды капушыліся ў начоўках, тычучы адно другога мяккімі, пухнаценькімі мордачкамі. Паводдаль сядзела старая кошка і раз-по-раз пазірала сумнымі вачыма то на начоўкі, то на Настулю. Ды падыходзіла часам да начовак, абнюхвала якое кацянё, старанна аблізвала яго, ды пачынала мяўкаць на ўсю хату.

---

*) Вайною — гэта урывак з вялікай аповесьці беларускага савецкага пісьменьніка Міхася Лынькова—„На чырвоных лядах," кн. І. (Менск, 1934 г., бач. 322). На гэтую аповесьць мы зьмясьцілі рэцэнзію гр. Ст. Станкевіча ў кн. 2-й „Калосься" з 1935 г., гдзе і пададзены шырэйшыя інфармацыі аб творчасьці пісьменьніка. У урыўку пакідаем магілёўскія дыялектычныя уласьцівасьці мовы пісьменьніка.

Міхась Лынькоў нарадзіўся ў 1899 г., у в. Зазыб'е, на Віцебшчыне. У 1913 годзе скончыў народную школу, пазьней вучыўся ў Рагачоўскай настаўніцкай сэмінарыі, якую скончыў у 1917 г.

Па сканчэньні сэмінарыі працаваў настаўнікам у Гомельшчыне. З 1919 да 1923 быў у чырвонай арміі. Пасьля йзноў настаўнікам, адначасна праводзіў шырокую грамадзка-палітычную работу. У 1925 г. уступіў у камуністычную партыю.

Міхась Лынькоў адзін з вялікіх літаратурных талентаў Усходняй Беларусі. Добры знаўца псыхолёгіі і быту беларускага народу.

Пачаў друкавацца ў 1926 г. Творы ягоныя вызначаюцца вялікімі мастацкімі якасьцямі, рэалізмам і канкрэтнасьцю, напісаны сакавітаю, вобразнаю народнаю моваю. Р э д а к ц ы я.

— Іш ты яе, жывотнае, а не кажы-ж ты, матка як ніяк, разумее... — думалася Настулі і яна кідала дзіцёнку:

— Ты вот, Ганначка, кінула-б ужо іх, навошта ціскаеш так... Кінь, дачушка...

А на дварэ мычэла пад вакном цялушка-пералетак і новыя думкі ўкліньваліся ў Настуліну галаву, не давалі ёй супакою, адпачынку.

— Управіцца вось, ды схадзіць хіба ношку травы якой прынесьці, у ярыне назьбіраць, бо дзе тая трава на паплавах, пакасілі ўжо... І столькі-ж клопату, вечна галава забіта, дзіва тобез гаспадара: і пасей, і пажні, і пакасі, аб гумне падумай каб пусьціў хто колькі тых коп злажыць... Ды й бегай, кланяйся, каб хто змалаціць пасобіў... Ды не дарма-ж усё—вот атажні, прыдзі бульбу капаць, прыдзі лён трапаць па восені, вытчы трубку кужалю. Табе на грош, а ім вот на рубель адрабі, дзіва то, ласыя на чужыя рукі. І петуйся дня і ночы, а з'есьці калі, дык вот душыся паронкамі, душы дзяцей нішчымніцай. Нарабілі вот, каб на іх немач, вайны ім захацелася, каб яна ўжо, даруй Божа, у горла колікам ім...

А каму — ім — хто яго ведае... Казалі вот людзі — германцы на нас насядаюць, душаць людзей, страляюць, газы тыя пушчаюць. І хто ведае, чаго гэта яны на нас так уз'еліся, хіба ім мала зямлі сваё, цары мо' пасварыліся? А з чаго-б ім сварыцца, здэцца-ж ня ім аб паранках думаць, аб бульбе той з шалупаямі.

— А можа гэта грэх пра цара ды так думаць? Хіба здарма вот і ў малітве пра цара гаворыцца, пра „гасудара нашага Мікалая Александравіча“... Відаць-жа што нездарма, вот-жа й на партрэце ізноў.

На засіджанай мухамі фатаграфіі сядзіць на чорным кані ён, Лявон... Узьняў шаблю ўгару, а конь на дыбкі, грае бліскучымі вачыма, белыя шчоткі на капытах... І прыгожыя штаны ў Лявона, сінія, сінія... Ды па іх канты чырвоненькія, ды чырвоныя грудзі, а колькі шнурочкаў розных ды з круцёлачкамі бліскучымі. А шапка, шапка з белым арлом, шнурок ад яе аж на грудзі, да гузікаў. Вочы ў Лявона— глыбокія й чорныя. Вот так і ўзіраюцца ў цябе, нібы пытаюць:

— Ну, як пажываеш, ненаглядная супруга, мая Настуля? Як нашыя дзеці?

А ўнізу незразумела так, літарамі залатымі — покуль прачытала, язык дуб дубам:

— „Лейб гвардыі яе імпэратарскае вялікасьці Александры Фёдараўны уланскі полк.“

Царыца то. Казаў вот, як на пабыўку прыяжджаў. У цара, казаў, яшчэ шмат палкоў усякіх, ды вялікая армія, пяхота, анцілерыя там ды шмат яшчэ чаго...

Як прыяжджаў, бегалі ўсім сялом усьлед, дужа-ж тую форму ўпадабалі, важнецкая форма. „Ляпей як у афіцэра“ — казаў дзед Панкрат, стары салдат мікалаеўскі. А Зьмітрачыхін Панас— прыяжджаў разам — дык той мусіць-жа ад зайздрасьці дзеду Панкрату:

— Ты не глядзі, дзед, на шапку бліскучую... І яны чэсьць аддаюць афіцэрам нашым... пяхотным...

Дзе ты тут разьбярэш. Канечне, салдат... Вот-жа й адрас салдацкі з уланскага таго палка. Ростам быў высокі, таму і ў уланы забралі — так казалі людзі. Настуля бярэ за карткай стопку шэрых лістоў і, старанна пераглажыўшы іх, кладзе йзноў за партрэт.

— Сьніўся вот пазаўчора. Нібы на пабыўку прыйшоў, а я нібыта проса сушу на печы... Каб-жа то спраўдзілася! Але што-ж гэта я, чыгуны павыплывалі, хіба таўчы ўжо. Да ціху ты, неўгамонны... Бач, моду знайшоў, чуць што, ды і біцца. Малое, а ўжо з кулакамі лезе, сястру крыўдзіць... Падай вот таўкач лепш. Бульбяная пара засьцілае ўсю хату, расою кладзецца на замурзаныя шыбы вакенца, да пачуўшы едзіва яшчэ больш скавычуць парасяты за дзьвярамі, ды ходарам ходзяць дзьверы пад напорам сьвінога лыча.

— Нішто вам, вытрымаеце, вот укіну яшчэ мякіны крыху, дзе на вас бульбы аднэй набярэшся... Ну, хіба ўжо... ідзіце дзеткі падалей. — Настуля адчыняе дзьверы і ў хату трухам кідаецца сьвіньня, аж пасклізаецца па падлозе, і ўсадзіўшы лыч свой па самыя вочы ў карыта, хапае на повен рот, аж трасуцца папэпаныя вушы, ды ходарам ходзяць па бакох сухія рэбры. За сьвіньнёй кідаюцца на выперадкі парасяты і з візгам і скогатам ваюющь за мейсца ля карыта, адштурхоўваючы адзін аднаго, кусаючы адзін другога за лыткі... Але старая сьвіньня наводзіць парадак: таму дасьць лыча ў бок, таго адштурхне нагой, таго так перакуліць, што аж залівaецца, скуголіць, ды асьцярожна прабіраецца да карыта.

— А ты чаго? Ідзі, ідзі, кажу, адтуль.

— Да я, мамачка, шчаціны нарву, на хібу вот, каравашнік цукерку дасьць.

— Я вот табе дам цукерку, цукерашнік, — злосна абзываецца Настуля, адцэжваючы паронкі, — ідзі вот сьнедаць.

Пасьнедаўшы, сабіраецца Настуля па траву схадзіць, але яе думкі перабіваюцца стукам у акно. Відаць, соцкі, па барадзе яго распазнаеш.

— Ды на сход, Настуля, на сход сабірайся.

— Дужа мне там вялікі клопат, мая то там справа?

— Не, не... Абавязкова. Нядоімку прыслалі спаганяць... дык ня баўся хаця.

Нібы белы сьвет памутнеў, счарнела ў вачах адразу. Дзе ты возьмеш нядоімку тую... Спасобія таго хаця-б на крупы хапіла. Хацелася-б вот у панскае калі схадзіць, зарабіць залатоўку якую, дык дзе ты тут з дзецьмі ўправішся... Пазычыць у каго? Ды дзе ты, у каго? Кожны без капейкі лахае. Хіба ў старасты?

Дужа ён табе раськінецца... Уга... І пытаць ня варта, у кобеля ў гэтага, ды й за бульбу яму шчэ' ня плочана. Не, трасцы, не дачакаецца, каб гэта... — і Настуля з агідаю ўспамінае яго прыставаньні на пожні, яго скрыўлены злосьцю твар, асклізлыя шчыліны воч, гарэўшыя зьвярыным палам. Уга, не на тую напаў. Шолудзь.

Калі Настуля разам з другімі бабамі-салдаткамі падыходзіла да стараставай хаты, там ужо сабіраўся сход і тлум галасоў поўніў усю вуліцу. Сабіраліся на бярвеньні. Хто сядзеў на хваёвых старастаных кражыках, хто вот проста так на трэсках, на шуме тым ад кары ля бярвеньняў прымайстраваўся. Іншыя стаялі паўкружка, гаманілі, зьбіўшыся паасобнымі купкамі.

— Уга, армія прышла, дывізія бабская ў паходзе, шабеты цягне з грашмі, — жартуе, шамкаючы бяззубым ротам, дзед Панкрат.

— А ты вот падстаўляй кішэні, прыпасьлі для цябе, для бяззубага... — у тон адказвае ўдава Барташыха. — Бач ты, вышкаляецца, а з самога ўжо пясок сыплецца.

— Цыц, ты, цыц! Зачапі яе, дык яна табе нагаворыць..

— А ты іх, браце Панкрат, не чапай, яны цяперачка ўга, дужа-ж ужо злосныя, пападзіся адзін—на кавалачкі разьдзяруць.. Дзіва то, бяз мужыкоў ходзяць, — уторыць Панкрату яго прыяцель дзед Сымон і яго выцьвілая казьліная бародка трасецца ў тахт рогату. І не рагоча, а вот проста так: кхе-кхе-кхе... Ды закашляўся вось і папярхнуўся і зашоўся аж, ніяк ня можа адхыркацца, аж сінее стары ды ўсё — кхі-кхі-кхі...

— То-ж пярхун стары... У дамавіну пара, а ён яшчэ ў жарты ўкінуўся...

— Ды вы-ж... кхі-кхі-кхі...

— Маўчаў-бы ўжо, кігыкала старое, сівы корч... — Сход рагоча, спачуваючы бабам — дужа трапна старога падкалолі. Рагоча і ўраднік, маладым салдаткам падміргвае, хвацкі падкручвае зусім вот жоўтыя, як у пруса таго, кончыкі вусоў ды хвастае бізуном па наваксаваных халявах шчыгульных урадніцкіх чабатоў.

— Бач, ты, пузан! — перашэптваюцца бабы, тулячыся адна за другую.

Сход рагоча, усьміхаецца кожны, а ў каторага на душы кошкі скрабуць: як то яно будзе, чым яно ўсё ды абыйдзецца. І больш гэтай разгубленасьці, перапалоханасьці на тварах у салдатак. Усе пазіраюць украдкі на старасту, на ўрадніка, на заклапочаных і зьбянтэжаных соцкіх — дзіва то, абяжы ўсе вуліцы — і чакаюць, калі вот пачнуць гаварыць аб справе.

— Ну, дык хіба пачнём, староста... Ну, там каторыя бабы-маладзіцы змоўкніце хаця ўжо, а маладзейшыя марш адсюль адразу-ж... Давайце, хрысьціяне, пачнём сход. А справа-ж вам вядомая. Я вот старасту загадаў, каб ён праз соцкіх паведаміў

усіх, каб зараз-жа нядоімкі несьлі. Калі то быў час другую рату плаціць, хто з вас хаця-б паварушыўся. Дык вот у дваццаць чатыры хвіліны, каб гэта, значыцца, грошы ўносілі і ніякіх там разгавораў. Дык так што, хрысьціяне, стараста вот па чарзе выклікаць будзе па сьпісу, а вы рыхтуйцеся... Ды ў дваццаць чатыры каб мне хвіліны і ніякіх там разгавораў.. А калі хто ў няспраўнасьці акажацца, худа таму, вот-жа раней кажу, няхай тады на сябе пяняе, калі апішам што...

— А вот-жа хваробы вам, трасцы вам, а ня грошай,—раптам прарывае Барташыха. — Каб-жа духі з вас павыцягала, як цягнеце вы з нашага горба. Бач ты яго — дваццаць чатыры хвіліны... Мой сын вот трэці год як вошы корміць у акопах, ды вот і да меншага дабіраюцца. Дык дваццаць чатыры... Скулы вот табе дваццаць чатыры, бач, разгадаваў пуза!

— А ты, цётка, прывяжы язык за штакеціну, пакуль ня позна. Дужа ён у цябе порсткі, — адказвае ўраднік і не падкручвае ўжо, а нэрвова шчыпле вусы. — Ты вот пацякла як дзяжа тая і пашла языком мяньціць: латата, латата, глядзі лапатух нагоніш... А што і да чаго — і не дабярэш. Ну, служыць твой сын і няхай служыць. На тое ён салдат, на тое і прысягу царскую ён прымаў, каб веру сваю, цара свайго праваслаўнага да айчызну-матушку ад ліхіх ворагаў аберагаць. І прычым-жа тут падатак... Патрэбны грошы дзяржаве? Патрэбны...

— Дык няхай і возьме...

— Дзе ж яна возьме?

— А дзе хоча... Пры чым тут мы? — чуюцца нерашучыя галасы з натоўпу.

— Дужа мне тут з вамі разгаворы разгаварываць... Сказаў, і каб ні гу-гу... Каб зараз-жа было ўсё выпаўнена. Ды пажывей. Выклікай, стараста!

А сэрца так і заходзіцца ў Настулі, калі ўсё бліжэй і бліжэй яе чарга па падворнаму сьпісу. Вот ужо Іван Цыбала доўга поркаецца ў сваёй шабеце ды адвярнуўшыся шукае, каб адабраць больш старыя, самыя трухлявыя, дзіравыя траячкі і рублі. Аж сапе небарака.

— Эге, нешта й вы, дзядзька Іван, падкульгалі. Што-ж гэта? Заўсёды такі спраўны, а тутака аж дванаццацера рублёў, —пытае ўраднік.

— Няўпраўка бачыце, пане ўраднік... Ізноўжа сена тут падышло, ня было часу, — і аддаючы грошы і шкадуючы іх Іван думае аб будучых барышах на сене з панскае пожні: „уга, у дзесяць разоў назад вазьму, з гакам, можна сказаць, пакрыю, але-ж канечне, і рубля шкода, на дарозе ён табе не валяецца... а капейка да капейчыны...“ Аж уздыхнуў.

Ужо плачуць некаторыя маладзіцы: будуць у іх палатно апісваць. Галосіць старая Ёўдакіміха — запісалі ў яе карову. Некаторыя пабеглі грошы шукаць пазычыць, некаторыя стаяць ўнурыўшыся, да ўсяго бязуважныя і чакаюць свае чаргі.

— Божачка, што та будзе са мной? — мітусіцца непакойная думка Настуліна.

— Наста Мікалаішка!

— Тутака я...

— Дык з цябе... з цябе... чатырнаццаць рублёў з цябе ды семнаццаць капеек. Прынесла хіба? — і старастава рука трымае напагатове абгрызены аловак, ды вочы старастава глядзяць вот, прысасваюцца, як п'яўкі балотныя, слізкія — ня міргнуць нават. І ў вачох тых чытае Настуля: „ага, папалася, гадаўка, вот табе за ласку тваю.“ А ў горле ў самой вот пяршыць, пяршыць, так і сьціскае горла болем пякучым, гаручай крыўдай. Ну й няхай, ну й што-ж, прападзі яно ўсё пропадам.

— Няма ў мяне...

Усьміхаецца ўраднік у вусы — вот маладзіца-ж ядроная, нібы яблык-антонаўка — ды кідае ўголас:

— А ў каго-ж яны будуць, каб гэта за цябе ды за прыгожую такую нядоімкі плаціць?

— Сказала — няма... і нямашака...

— Дык хіба цялуху запішам? — пытаецца стараста ў ўрадніка гэткім халодным бязуважлівымі голасам, а сам пазірае скоса на кабету.

Скаланулася Настуля, пасунулася наперад на крок, сьцяўшы рашуча кулакі. Ня даць! Якое яны маюць права адбіраць выгадаванае табой, рукамі тваімі выпеставанае. Вот павыдзіраць вочы гэтыя агідныя, павыскубаць жоўтыя вусы, на кравянку пусьціць гэты нос урадніцкі, бурбалку гэтую паліваную. Толькі ня даць!

Але абмякла разам. Апусьціліся зьнясіленыя рукі, што ты тут зробіш. Ды й народу сорамна. Што-ж, няхай...

— А хіба хопіць цялушкі на выплат? — пытаецца ўраднік старасту.

— Пералетавак... Нішто цялушка, мо' хто й купіць... Цана-ж невялікая...

— Дык от і я-б купіў хіба, каб гэта канечне пасхадней...— пераміваецца з нагі на нагу Іван Цыбала і ўнікае каб сустрэцца з кім вачыма, бо чуе як колюць яго злосныя шэпты, галасы азьвярэлыя: „Крывасмок, кожнага на бэльку засіліў-бы.“ А сам думае: „Дзівакі людзі, ну што я зрабіў ім. Хіба не ахвота кожнаму, каб гэта таней ды зручней. Чаму-ж гэта й ня купіць, калі яно зручна. І хто-ж гэта да сваёй гаспадарцы вораг?“

— Дык калі так, запісвай, стараста, — загадвае ўраднік.

— Ну што-ж, бярыце... І хату сабе бярыце... І сьвіньню бярыце. Дзетак сабе бярыце, жытку маю, кроў маю — усё бярыце, жывалупы... І ты вот, дзядзька Цыбал, прыходзь... Мала табе ўсё, дык знайду яшчэ чым мяла тваё заткнуць пражорнае...

— Дай ты ёй рады... — шэпча Цыбал і туліцца за сьпіны другіх, уцяўшы голаў у плечы.

Звадыякі гэтыя сьлёзы. Трымалася-б, дык дзе там. Засьцяць вочы і плавае вуліца ў тумане шызым, не заўважыла, як і ў хату прышла, села на ўслон ля акна і так і прасядзела нярухома, пакуль ня прышлі на двор соцкі, ураднік, стараста. Ды малеча зьбеглася з двароў суседскіх, падзівіцца. Старыя, тыя ня пойдуць, каму ахвота на чужое гора глядзець. Доўга ганялі цялё па агародчыку, пакуль не зьвязалі вяроўкай за шыю, павялі да варот, падганяючы хлабысьцінаю. І тады ня вытрымала Настуля. Падкацілася камяком да грудзей злосьць вялікая, зьвярыная злосьць. З сянец выскачыла, гнеўная, чырвоная, з ускудлачанымі валасамі, з расхрыстанымі грудзьмі. Ухапіла ў рукі таўкач і рынулася, пабялеўшы і сьцяўшы зубы, замахнулася таўкачом над ураднікаваю галавою.

— Ціху ты, што ты, з розумам, Настуля — кінуўся соцкі Зьмітрок і выбіў таўкач з рук, — апамятайся, небарака, ці варта цялё таго, што ты задумала...

А ўраднік, спакойны, вот толькі крышачку зьбялелы, адступіў на крок які і размахнуўся бізуном. Прасьвістаў той у паветры і ўліп у Настульчыну сьпіну, кончыкам сваім сьвінцовым працёгшыся па грудзёх, па шчацэ. І яшчэ раз апаясаў бізун, прашоўся з поцягам па здрантвелым ад жудасьці целе.

Умэнт ня стала дзяцей на двары, разбегліся, хто куды.

Ураднік стаяў і глядзеў з асалодай, як крывіўся твар, рабіўся няпрыгожым гэты твар такой прыгожай і ядранай, як антонаўка, маладзіцы, як уздрыгвалі нібы ашпараныя варам плечы, ды пальцы рук хапіліся за рассечаную шчаку. І хацелася даць яшчэ, скрамсаць на друзачкі гэтае жывое, прыгожае цела. Гэтыя прывабныя, чырвоныя шчокі. Аж соладка зудзела ў руках.

— Кіньце вы, пане ўраднік! — кінуліся соцкія. — Ото-ж неразумная баба, маладая вот, гарачая, жыцьця таго як сьлед не пабачыла... Кроў яшчэ ня выбрадзіла...

— Я вот выбраджу... Была-б другая на месцы яе, дык пакарміла-б клапоў у халоднай з тыдзень, выхадзілася-б... Ды ладна ўжо, я чалавек ня злосны...

Стараста стаяў моўчкі і ў яго вачох сьвіцілася сытасьць і задаволенасьць.

— Ну, дык пойдам хіба...

Настуля як села на двары на прызьбе хаты, так і прасядзела да позьняга вечара. Схаваўшы твар у далоні рук, яна ня рухалася з месца і цяжкія, як тыя шэрыя камні, — варушыліся ў галаве думкі. Жорнамі ціснулі на мозаг. Уткнуўшы насы ў шыбы акон заліваліся плачам дзеці ў хаце.

—Каб вы хаця ўжо падохлі, клопат-бы зьнялі ад мае галавы...

І дзесьці глыбока ўзварухнулася пачуцьцё матчына, на грэшную благую думку абразілася...

— Чым-жа яны вінаватыя... мае любыя...

Устала і чапляючыся за сьцяну пашла ў хату, сабрала павячэраць дзецям ды ўлеглася на палаці. Не хацелася ні распра-

нацца, ні пасьцілаць дзяругі тыя, узьбіваць падушку нанач. Як лягла, так і ляжала з прыжмуранымі вачмі, так і заснула нераспранутай.

Пад вечар на другі дзень соцкі зашоў. Патоўкся з хвілінку ля парога, на ўслончык сеў.

— Дарэмна гэта ты, Настуля, учора... Дзе ты гэтай саломінай абуха пераб'еш?

— Ат, не кажыце ўжо...

— Ды гэта я к слову... Бачыш, ужо служба ў нас такая, каб з людзьмі напастыляцца. Ізноў-жа ўраднік: ты яго халеру пальцам крані — ў астрозе згнояць.

— Ды я да вас, дзядзька Зьмітрок, і ня маю нічога... Хіба вы тут вінаваты ў чым...

— А я думаў, крыўдзіцца ты будзеш.. Усё-ж-ткі Лявон быў— хоць і маладзейшы куды ён — але-ж вялікі дружака мой. Колькі то на зайцоў папаходжвалі, на ліса... Харошы быў чалавек, Лявон, дай вот Божа вярнуцца яму... А я вот па справе, ліст табе тут заказны, з арміі відаць, ад Лявона. Дык ты ўжо ня крыўдуй на мяне.

— Ды што вы, дзядзька Зьмітрок, далася вам гэтая крыўда! Узялі вот, ну дык што-ж... Няхай іх ужо за печані возьме... Не ў пятлю-ж мне лезьці...

Вышаўшы Зьміцер, дзьверы за сабою прычыніў, вот чутны крокі яго, хворткаю рыпнуў. Да ўсяго цяпер прыслухаецца чутка Настуля пасьля ўчарайшага. Вот трэсьне бэлька над печчу, заварушыцца шашаль у дошцы — і чуе Настуля, балюча прыслухаецца да кожнага гуку.

Запаліўшы лямпку ўзялася за ліст. І доўга ўглядалася ў незнаёмы почарк—не Лявонава рука то, ды й пячаткі навошта — і раптам зьбялеўшы перачытвала раз-по-раз кароценькія радкі. Ня верылася, не разумела, як то можа быць, каб Лявон... Каб мой Лявон... Гэты вясёлы, вечна ветлівы хлопец. І такія рукі, кража падымаў за адзін канец, гэткія ванчасы ўскідаў на кары? Ня можа быць... Няпраўда... Мо' маняць гэтыя літары слоў? Мо' ня так прачытала?

А словы ўсё адны і тыя, слоў гэтых ня зьменіш, не пераставіш...

„...за веру, цара і айчыну паў сьмерцю харобрых на ратным полі...“

На ратным полі...

На полі...

Сьмерцю...

І калі зразумела — сьмерцю — тады схапілася аберуч за галаву і загаласіла немым голасам, голасам дзікім, зьвярыным, ад якога сьціхлі дзеці, што коўзаліся па бруднай падлозе, гуляючы ў нямудроныя свае гульні. Сядзелі моўчкі, і палахліва — вот, вот гатовы заплакаць — пазіралі на матку. Тая білася галавой аб стол, сьціскаючы ў руках канцы апаўзаўшай скацеркі, ды нема ўсё галасіла. Мігацела лямпа і яе водбліскі клаліся палахлівымі плямамі на чорныя сьцены, на столь, на заваленыя рызьзём палаці.

Урэшце змоўкла яна, неяк выпрасталася раптам, выцерла хусткай вочы, кінула руплівы позірк на хату, дзяцей заўважыла.

— Тутака вы... Хадзіце вот да мяне...

І лашчыла кудзелістыя галовы і думала ўголас:

— Паспытаеце вот гора людскога, бязбацькавічы... Вялікае яно — ні канца, ні краю... Хто та аб вас будзе клопат мець... Дзіва то — людзі зьверы, кожны другога рад за горла ўхапіць... мала ўсё... Ненажэрныя людзі, ненажэрная злосьць людзкая... Але-ж што мне рабіць цяпер? — і прыслухалася да вячэрняй цішыні, нібы чакаючы адказу на свае думкі.

Ніхто не адказваў. Толькі шкрэблі мышы ў падпечку, ды недзе ў сьценцы тачыў дрэва шашаль.

Міхась Лынькоў

У лесе

Звоняць тугія сасновыя струны,
шышкамі рэха калышыцца звонка.
Слухайце-ж вы, маладыя сасонкі:
больш я ня буду задуманым, сумным!

Час яшчэ твару майго не зразорыў,
плечаў ня сьціснуў гадоў шэрых камень,
кожнае дрэва адбіў-бы рукамі,
ночы і дні гаварыў-бы я з борам.

Можа ня ведаю, лес мой кудлаты,
хто тваё цяглае зрэжа бярвеньне,
выпаліць сонца калі твае цені,
будзеш палацам ці згорбленай хатай...

Можа слупамі ты белымі станеш
ноччу васеньняй, дажджліваю, шэрай...
Дзікі каршун прыляціць на вячэру,
ў вочы адважныя, згасшыя гляніць.

А покуль вецер калыша бор шумны,
раніца поіць зары сырадоем, —
я запяю пра жыцьцё маладое, —
больш я ня буду задуманым, сумным...

17.VI.37. *М. Танк*

Этычныя падставы нацыянальна-культурных правоў нацыянальных меншасьцяў*)

...Этычныя падставы нацыянальна-культурных правоў нацыянальных меншасьцяў тасую тут у агульна-людзкім разуменьні, каторыя звычайна выражаюцца ў тым, што быт лепшы ад нябыту, лепшы альтруізм як эгоізм, дабра належа трымацца, а зла старанiцца, лепшы поступ і культура кожнага народу, як яго застой, рэакцыя, нядоля й сьмерць.

Гаворачы агульна, этычныя падставы нацыянальна-культурных правоў нацыянальных меншасьцяў можна зсынтэзаваць у наступныя пункты.

1. Кожны народ, а знача й нацыянальныя меншасьці, мае прыроднае права аберагаць і разьвіваць свае нацыянальныя розьнасьці і асаблівасьці, як мову, рэлігію і цэлы нацыянальны свой быт, бо:

a) народы разам з сваім асобным нацыянальным характарам, а так-жа з інстынктам сваім да разьвіцьця паўстаюць з самай прыроды, а дзеля гэтага маюць і прыроднае права свайго існаваньня.

b) Асаблівыя нацыянальныя адзнакі кожнага народу, прадусім мова, зьяўляюцца прыродным дабром, як спадак мінуўшчыны, пазбаўленьне каторых руйнуе яго прыродную асобнасьць, нішчыць яго нацыянальную індывідуальнасьць, робячы гэтым самым яўную кожнаму народу крыўду.

І дзеля гэтага грамадзяне, што належаць да нацыянальных меншасьцяў, маюць права дамагацца ад дзяржавы, у каторай жывуць, каб яно гэнае дабро аберагала, як і ўсякае іншае дабро сваіх грамадзян агулам. Такім чынам дзяржава павінна рупіцца, каб вобак мовы дзяржаўнай, даць магчымасьць сваім нацыянальным меншасьцям карыстацца іх прыроднай мовай у школе, судзе, урадзе, у публічным жыцьці агулам.

2. Нацыянальныя меншасьці з самай прыроды маюць роўныя грамадзянскія правы з пануючай нацыяй. Іх лічбовая меншасьць, ці мо' культурная ўбогасьць, у нічым прыродных іх правоў не зьмяншае, бо яны, як і нацыя пануючая, зьяўляюцца часткай дзяржавы, спаўняючай усе абавязкі грамадзян. Знача, нацыянальныя меншасьці маюць роўныя правы на прадстаўніцтва парлямэнтарнае, на школу ў сваей роднай мове, на ўрадавыя пасады, на

*) Кс. Ад. Станкевіч, як прадстаўнік ад Бел. Нац. К-ту ў Вільні на Кангрэс Нацыянальных Меншасьцяў у Лёндане 14—15 ліпня 1937 г., дзеля незалежных ад яго прычын ня могучы там быць асабіста, пад вышэй азначаным загалоўкам прызначаны яму рэфэрат выслаў на гэны Кангрэс поштай. Выкідаючы з гэтага рэфэрату тое, што для беларускага чытача няцікавае, галоўныя пункты яго падаём у цэласьці. Р э д.

пропорцыянальнае да свайго ліку карыстаньне з дзяржаўнага скарбу для сваіх грамадзкіх і культурна-нацыянальных мэтаў.

3. З самай сваей прыроды імкнуцца да развою і культуры, як людзкія адзінкі індывідуальныя, так і грамадзкія супольнасьці, асабліва-ж нацыянальныя. Развой-жа належны гэтага прыроднага інстынкту кожнага народу, а так жа яго культурнае творства, адбываюцца найлепш у яго роднай мове і агулам на падставах нацыянальна-прыродных, уносячы гэтак у агульна-людзкую культуру новыя вартасьці, новыя здабычы.

4. Этычна злой ёсьць справай усякі надмерны, нічым неаграніченый эгоізм як людзкой паасобнай адзінкі, так і людзкой адзінкі зборнай: грамадзкай клясы, народу, дзяржавы. Непрызнаваньне-ж якім-небудзь пануючым народам культурна-нацыянальных правоў нацыянальным меншасьцям іменна паходзіць з гэнага неаграніченага, немаральнага нацыянальнага эгоізму, які імкнецца да таго, каб коштам слабейшых ад сябе нацыянальных меншасьцяў узбагаціць сваю культуру і сваю эканоміку. Ведамай ёсьць рэчай, што пазбаўленыя якой дзяржавай нацыянальныя меншасьці сваіх нацыянальных правоў звычайна пад кожным узглядам крыўдзяцца і экспле͏ётуюцца.

5. Нацыянальныя меншасьці дзеля зьбераганьня сваіх нацыянальных асаблівасьцяў, тварэньня сваей уласнай нацыянальнай культуры, а так-жа дзеля адміністраваньня сваіх грамадзянскіх спраў, маюць права на аўтаномію. Этычная падстава гэтага вынікае з мэты кожнай дзяржавы. Сутнасьць гэтай мэты ня ў тым, каб пануючы ў дзяржаве народ ці агулам дзяржава павялічвала да якнайбольшай меры сваю сілу й магутнасьць, але ў тым, каб усім сваім грамадзянам, бяз розьніцы іх нацыянальнасьці і веры, дало дабрабыт і памыснасьць, а гэтым самым уцьвярдзіла і сваю сілу і магутнасьць.

6. Вялікім дабром этычным ёсьць супакой між народамі і дзяржавамі? А супакой гэты сяньня ў Эўропе ня можа быць трывалы, пакуль 40 мільёнаў нацыянальных меншасьцяў, сьведамых сваіх уласных заданьняў і асаблівасьцяў, часта пазбаўленых сваіх элемэнтарных магчымасьцяў культурнага свайго жыцьця, — не здабудуць сваіх прыродных нацыянальна-культурных правоў.

7. Права на ўласную мову, рэлігію, культуру і аўтаномію кожнай нацыянальнай меншасьці вынікае ня толькі з этыкі агульна-людзкай прыроднай, але так-жа й этыкі хрысьціянскай, каторая ў гэтай справе дасканальна выражаецца ў усталенай формуле: *suum cuique*, а якая фактычна ёсьць далейшым разьвіцьцём і глыбейшым уняцьцем тых-жа этычных падстаў права прыроднага.

Этычная падстава хрысьціянскай навукі апіраецца на прызнаваньні, паглыбляньні і ўцьвярджаньні людзкой асабовасьці, як першараднага і адзінага асяродка поступу і людзкой культуры. Гэткія адносіны хрысьціянства да людзкой асабовасьці ня

нішчуць у ей нічога прыроднага, а знача й яе нацыянальнай асаблівасьці і рознасьці, але гэта ўсё вырабляюць, паляпшаюць, дасканаляць. Вось-жа кожная нацыянальнасьць у сьвятле хрысьціянскай навукі ёсьць матарыялам не для нішчэньня яго, але для тварэньня з яго культуральных вартасьцяў. Дзеля гэтага кожная дзяржава, каторая цікуе на адменны характар сваіх нацыянальных меншасьцяў і замест рабіць ім даступным іх нацыянальны развой, нішча іх і прасьледуе, — паступае немаральна.

Апрача гэтай прынцыповай хрысьціянскай этычнай падставы праваў нацыянальных меншасьцяў на іх жыцьцё і культурна-нацыянальны развой, у тэй-жа хрысьціянскай навуцы знаходзім у гэтай справе нормы ўжо нятолькі характару прынцыповага, але так-жа й практычнага. Вынікае гэта з загаду Хрыста навучаць *усе народы* (Мат. 28, 29), а так-жа з факту *Дараў сьв. Духа* (Апост. Дзеяньні 2, 4—11), дадзеных Апосталам, каб яны мелі магчымасьць апавядаць Эвангельле ў розных мовах розным народам. Вось-жа згодна з гэтым не ў клясычных мовах мелі Апосталы несьці народам хрысьціянскую навуку, але ў мовах родных кожнага народу.

8. Вынікам урэшце й практычным датасаваньнем гэных этычных падстаў прыродных і надпрыродных, а знача — такжа этычнай падставай, хоць ужо паходнай і другараднай, ёсьць права міжнароднае, ахраняючае права нацыянальных меншасьцяў на іх нацыянальную культуру і на аўтаномію ў іх пад гэтым узглядам дзейнасьці...

Ад. Станкевіч

Гыгіена псыхічная, як праблема аснаўных адносінаў да жыцьця

I

Само зьявішча *гыгіены* вельмі цікавае. Гыгіену ажыцьцяўляюць лекары, яны толькі яе разумеюць, дзякуючы ім гыгіена жыве і разьвіваецца. Ёсьць сяньня, можна сказаць, цэлая прафэсыя гыгіеністаў, як адна з галінаў веды і практыкі лекарскае. Пікантнасьцю, калі так можна казаць, у пытаньні гыгіены, гэта якга тое, што ў ёй працуюць лекары. Вельмі было-б дзіўна, каб мы пачулі, што нейкія рамесьнікі, скажам, шаўцы ці сталяры, разважаюць над тым, як дайсьці да таго, каб людзі не патрабавалі хадзіць у ботах ці зноў—каб чалавек мог пражыць бяз хаты, шафы ці яшчэ там нечага, што робіць і з чаго жыве шавец ці сталяр. Бязумоўна, кожны рамесьнік зацікаўлены ў тым, каб ягоная работа была найбольш трывалаю. Дзякуючы саліднасьці свае работы, рамесьнік ня меціме канкурэнтаў. Аднак, каб зусім бяз ботаў!..

Магчыма, што яшчэ адным з доказаў, што прафэсыя лекарская не зьяўляецца выключна рамяслом, што лекары, прадстаўнікі мэдыцыны — гэта ня толькі благія ці лепшыя рамесьнікі свае адумысловасьці, што яны маюць у сваёй працы яшчэ нешта, што называлі калісь *поклікам* амаль што ня боскім, гэным вось доказам і будзе факт, што якга лекары найлепш разумеюць і актыўна працуюць над тым, што завецца *псыхічнаю* гыгіенаю. На'т можна было-б казаць, што гэная дзялянка мэдыцыны будзе калі і наймаладзейшым дзіцянём, дык затое найбольш улюбленым.

Што-ж гэта такое гыгіена? Гэта практычнае датарнаваньне веды лекарскае да паясьненьня ўмоваў, у якіх чалавек жыве, ды адначасна гэта навука аб тым, як найлепш выкарыстаць гэныя ўмовы ў імкненьні да таго, каб чалавеку было якнайлепш. Мэтаю-ж гыгіены псыхічнае, як паказывае сам назоў, гэта імкненьне да поўнага здароўя псыхічнага чалавека, адначасна-ж гэта навука, паказываючая і абасноўваючая правіла добрага, здаровага жыцьця, цікаючы аб той вельмі складанай суцэльнасьці, якую завём душою, псыхікаю.

Паміж рознаякімі сказамі нейкіх вядомых ці зусім прапаўшых дзеля памяці нашае людзей ёсьць сказ, аб якім варта было-б часьцей думаць... „я ведаю адно толькі, што нічога ня ведаю“. Сказ гэны не гаворыць аб скрыпучай старасьці, аб зьнявераньні да ўсяго, што жывое, яркае. Наадварот, я сказаў-бы, гэта толькі паказальнік крытычных, зважных адносінаў да току жыцьцёвага. Такі сказ характэрны для сьпелага мужчыны, а не для палкага юнака. Мэдыцына — навука з галіны прыродаведы, яна вучыць крытычнага падыходу да зьявішчаў жыцьцёвых.

Ня гледзячы на нячуванае разьвіцьцё гэнае навукі, ня гледзячы на пазорныя магчымасьці, якія адчыняюцца перад ею ў будучыне, трэба прызнацца, што ўчора і сяньня жыцьцё чалавека мела, мае і меціме шмат чаго незразумелага, магчыма на наш пагляд на'т супярэчнага. На жаль, сяньняшняя мэдыцына ня ўмее лекаваць шмат якіх нядужасьцяў чалавека. Людзі не паддаюцца аднак зьнеахвочваньню, шукаюць нейкага выхаду. Гэная вось свомасьць чалавека і дала нам гыгіену ды адначасна і профілянтыку. Заклік „не дапусьціць да хваробы" сяньня вельмі папулярны ў мэдыцыне і ён найбольш мэтазгодны і зразумелы. Сяньня можна зусім пэўна сказаць, што чым вышэй гыгіена ў нейкім грамадзтве, дык тым вышэйшая там культура. Высокі ровень гыгіены — гэта ня толькі жарало здароўя, гэта прымета сьпеласьці асяродзішча.

Гыгіена займаецца рознымі старонамі жыцьця. Дзеля таго, кажам аб гыгіене вёскі, вялікіх гарадоў, аб гыгіене ротавае паражні, гаворым аб гыгіене школы, гыгіене хатняй, гаворым таксама аб гыгіене *псыхічнай*. Паасобныя галіны гыгіены займаюцца датарнаваньнем практычным правілаў гыгіены да канкрэтных умоваў жыцьцёвых адзінкі або нейкае суцэльнасьці людзей.

Зьмест пайма гыгіены ротавае паражні зразумелы. Цікуецца тутака аб тым, што рабіць і чаго не рабіць, каб не хварэлі зубы. Гыгіена псыхічная шмат менш папулярная, яе людзі найменш разумеюць, ня ўмеюць ацаніць, як сьлед, таго значэньня нашага паступаньня ў сфэры псыхічнай. У зьявішчах фізычных лягчэй наглядаць залежнасьць паміж двума зьявішчамі. Тутака вельмі часта безпасярэдна прыходзіць быццам біолёгічная кара за грэх проці загадаў натуры, усёроўна, ці мы ведаем ці не гэныя законы натуры. Нехта нічога ня чуўшы аб гыгіене вельмі добра зьдзейсьніе ейныя вымогі ў штодзенным сваім жыцьці. Возьмем вопратку. Ніхто ня пойдзе бяз вопраткі ў халоднае надвор'е, інакш апранецца на дождж, інакш на мароз. Калі-б ня быў згодны з гыгіенаю, скажам вопраткі, адчуе на сабе шкодныя сьледамкі — прастудзіцца, змокне, балеціме ў яго галава і г. д. Падчас дык у вельмі жорсткай форме прыходзіць практыка. Прыкладам, тыфус брушны ці сыпны сустракаюць таго, хто ня ведаў ці забыўся аб бактэрыях, хто ня хоча глядзець за чысьцінёю цела і дапускае да вошаў, плюскваў.

Ня бачым затое стульнага і безпасярэдняга злучва паміж „грахом" і „караю" ў плошчы псыхікі, а кара тутака ня меншая, чымся нядужасьці цялесныя, што будуць сьледамкамі нястачы гыгіены ягульнае. Праступкі проці гыгіены псыхічнае вядуць няўхільна вельмі часта да зацяжных хваробаў нэурозных, ды бывае і да нядужасьцяў псыхічных, нечага найбольш страшнога, што можа насустрэць чалавека.

Вока нашае прывыкла часта бачыць, што нехта быццам сьвядома лезе бядзе ў вочы, знарок не спаўняючы вымогаў гыгіены, а здароўе ягонае лепшае, чымся разважных і асьцярожных людзей. Блага аднак рабіў-бы нехта, калі-б хацеў знайсьці тутака аргумэнт проці гыгіены. Паказывае гэта толькі адно на вялізарныя сілы арганізму. І якга найбольш такіх памылковых прысудаў наглядаем у плошчы жыцьця псыхічнага. Амаль што немагчыма бывае паясьніць, што няшчасьце ўсяго жыцьця, нездаволеньне, варожасьць да сябе і людзей, — усё гэта сьледамкі не такое, як трэба, гаспадаркі ў далікатнай і заблытанай галіне псыхічных праяваў.

II

Ня цікую аб тым, каб даць агульны рэцэпт на „шчасьлівае" бясклопатнае жыцьцё, бяззакіднае са стараны вымогаў гыгіены псыхічнае. Хацеў-бы толькі прадставіць тыя аснаўныя лініі жыцьця псыхікі і чаму, дзякуючы нястачам на гэным фронце, можам лучыць у дысонанс натуральнае гармоніі току жыцьцёвага, свомага пачуваньню здароўя.

Нажаль хочучы гаварыць аб нейкім ідэале, трэба пачынаць з таго, што сапраўднасьць вельмі сумная і надта далёкая ад ідэалу. Што яшчэ горш—недахопы не заўсёды з нашае прычыны ды на'т магчымасьць іх выкінуць не на нашыя сілы. Гэта мяне ані крышку ня спыняе. Даўно тая эпоха за намі, калі грамадзка „нячыстым" рахавалі чалавека, паказываючага хараство бяз сродкаў на тое, каб кожны глядач мог прыблізіцца да яго і надыхацца ім ці наглядзецца.

Дык скажам ужо адно, што грамадзянства агулам мала ведае аб законах гыгіены псыхічнае—найчасьцей не ягоная ў гэтым віна. Крыніцы такое ці іншае рэчаістасьці хаваюцца ў грамадзкім ладзе, у прыналежнасьці да тае ці іншае клясы грамадзкае, гэта адначасна рэзультат канкрэтнай школы, у якой моладзь не пачула аб гэтым і г. д. Яшчэ горш, што калі і ведаем аб шкоднасьці некаторых зьявішчаў і сытуацыяў, дык прычыны і жаролы іх—незалежныя ад нашае волі. Грамадзкія ўмовы прынукаюць жыць часта так і ня йнакш, хаця проці гэтага бунтуецца розум і пачуцьцё. Нашае імкненьне ў кірунку перамены данага скажам ладу можа выклікаць раструскі ў жыцьці прафэсыянальным, таварыскім, хатнім і г. д. Бязумоўна, факты падчоркнутыя толькі што вельмі сумныя, паказываюць яны на тое, што толькі найбольш шырокая сьвядомасьць і сьвядомае імкненьне найбольш шырокіх сфэраў зчасам прывядзе да ліквідацыі супярэчнасьцяў, найчасьцей ясна толькі спадумных а не сапраўдных, якія ёсьць быццам паміж сапраўднасьцю ды ідэалам. Прыпомню тутака на адзін факт, даволі блізкі да зьместу нашых разважаньняў, а мяноўна — імкненьне працоўных масаў да васьмі гадзіннага рабочага дня працы. Дамаганьне вельмі правільнае, ды здаецца кожны чалавек павінен яго прыняць бяз нічога. Ня трэба забывацца, што была заміна ўсётакі і то не абыякая — кляса капіталістых ды іхнія інтарэсы. Залежнасьць

эканамічная работніцтва ад фабрыкантаў доўга адкладала зьдзейсьненьне гэнага дамаганьня. Не асталося яно ўсётакі лятуценьнем і прыждаўшы часіну, калі ўся маса працоўная пачала разумець сваё абсалютнае тутака права, дык аканчальна работніцтва дастала тое, чаго дамагалася.

У плошчы гыгіены псыхічнае трэба перамагчы ня толькі заміны вонкавыя, трэба паладзіць і з тым, што замінае нам самым ад нашага характару, прывычак, забабонаў, гэных апошніх апранутых у вопратку „загадаў", звычаяў таварыскіх, клясавых і г. д. Чад ці густая імгла абтуляе нас стульна і слова праўды, ды пачуцьцё здаровага мужыцкага розуму ня можа дабіцца да нашае сьвядомасьці. Дык як заўсёды кожную рэформу трэба пачынаць ад самога сябе і найбліжэйшага асяродзішча.

Вышэй гаворачы аб зьмесьце пайма гыгіены казаў я, што гэта навука ды адначасна практыка здароўя псыхічнага. Зусім на месцы будзе пытаньне: а што гэта такое здароўе псыхічнае, якія свомасьці чалавека здаровага?! Ці не хаваецца за гэнаю мянюшкаю нейкая штучка, якою можна забаўляцца, зьмест якое лішне малы, каб сур'ёзна чалавек мог захапіцца гэнаю ідэяю? Адказ навукова абаснаваны на пытаньне, што такое здароўе, — даволі складаны. Карыстаемся тутака агаворкаю папулярнаю, што здароўе там — дзе няма хваробы, і наадварот—хворым будзе той, хто нездаровы. Гэта не замінае нам, каб мы не разьбіраліся добра, аб чым мяркуем у адным пайме і другім. Прыродная лёгіка і розум ясна бачаць, ня ўмеючы ўсяго добра пераказаць словам. Здароўем завём тое, што не адыходзіць ад сярэдняе нормы. У гэнай галіне, як у шмат іншых, карыстаемся мэтодаю параўнавальнаю, так як у адносінах да хараства і г. д. Дык можна было-б запытацца, ці дапушчальна гаварыць аб здаровым псыхічна і яшчэ здаравейшым? І хаця на першы пагляд сядзіць тутака нейдзе парадокс, аднак калі толькі спамянем, што з паймом нормы стульна злучана паймо ці пачуцьцё таго, што філёзофы называюць дабром, калі зноў далей уявім, што чалавек жыве па тое, каб пражыць пэўную суму шчасьця, дык тады лягчэй паясьніць сабе, што нехта здаровы — значыцца ня чуе ў сабе націску ад'емных старон жыцьця, дык той самы чалавек яшчэ больш інтэнсыўна можа адчуваць хараство і дабро, можа быць больш шчасьлівым, а гэта ён зьдзейсьняе рэалізуючы вымогі гыгіены псыхічнае, адкідаючы ўсё, што замінае на гэным шляху ды адначасна павялічваючы ўсе скарбы, з якіх складаецца сапраўдны зьмест жыцьця. Бачым тады, што імкненьне гыгіены стульна спалучана з разьвіцьцём і паймом культуры духовае.

III

Бязумоўна, гыгіены псыхічнае немагчыма аддзяліць ад жыцьця цэлеснага і ўсіх ягоных патрэбаў. Беспахібнае дзеяньне ўсіх органаў чалавека зьяўляецца фундамэнтам, крыніцаю гармоніййнага разьвіцьця функцыяў псыхічных. Аднак здаволеньне гэных патрэбаў яшчэ ня будзе ўсім, чаго дамагаецца псыхічная гыгіена.

Жыцьцё адзінкі, жыцьцё вялікіх грамадаў чалавецкіх прадстаўляе адну працяжную лінію. Ніколі ня будзе так, што да сяньня скажам нехта жыве так, а ад заўтра кажа, што ён будзе жыць пановаму. Дзеля гэтага, пры мяркаваньнях гыгіены псыхічнае трэба нам зьвярнуцца да таго месца, дзе пачынаецца жыцьцё. Гыгіену псыхічную рэалізуем амаль што не са дня нараджэньня дзіцяці. Залежна ад веку, залежна ад сытуацыі агульнае, залежна ад плоці, ад прафэсыі вымогі са стараны гыгіены будуць іншыя, аснова заўсёды тая самая. Тая аснова, прынцып, зьмяшчаецца ў загадзе прыдбаць найбольшую колькасьць пазытыўных цэннасьцяў, адкідаць ад'емныя, значыцца прыдбаць шчасьця і сустрэнуць на сваём шляху найменш благога.

Загады гыгіены псыхічнае ў дзіцячым веку будуць аднолькавыя з вымогамі *ўзгадаваньня*. Усе дзейнікі, з якімі сустракаецца дзіцянё, пакідаюць на ём сьляды і яны даюць тую форму, паводле якое мы аканчальна ацэніваем чалавека. Шмат чаго найлепшае ўзгадаваньне ня зробіць. Малая адзінка зьяўляецца на сьвет з прыроджанымі свомасьцямі, якія мы завём канстытуцыяю цялеснаю і псыхічнаю. Нічога ня можам зрабіць на вонкавыя ўмовы геаграфічныя, кліматычныя, незалежныя ад нас умовы асяродзішча, умовы культуры агульнае. Дык калі шмат якія мамэнты ў будучага чалавека незалежныя ад сьвядомага дзеяньня ўзгадаваўцы, дык ня можам прайсьці моўчкі ў тых дзялянках, у якіх усё залежыць ад пакладзенае натугі бацькоў і ўзгадаваўцаў. Калі, скажам, дзіця пралетара і дзіця бацькоў клясы заможнае самым фактам прыналежнасьці да розных клясаў грамадзкіх маюць шмат свомасьцяў у пазьнейшым сваім жыцьці далёкіх ад сябе. Усётакі заўсёды можна знайсьці такую лінію, якая палягчыць у будучыне жыцьцё адзінцы.

Пуцяводнаю зоркаю хай будзе лёзунг: „не пашкодзіць нашым узгадаваньнем дзецям". Як ужо была вышэй гутарка, усё жывое імкнецца да пэўнае сумы шчасьця. Пры ўмовах грамадзкага жыцьця собскае імкненьне да шчасьця ня можа замінаць такому імкненьню другога чалавека, ці ўсіх людзей, як цэласьці. Дык трэба вучыць змалку, сапраўды ад першых дзён жыцьця, каб умець зрачыся дабра-шчасьця собскага, рэалізаванага на найкарацейшым шляху, калі гэта асабліва спалучана із шкодаю іншых. Агулам, не дацэніваецца, як сьлед, усё значэньне гэнае вымогі. Ня дарма Хрыстос абвесьціў жыдам а затым і пазьнейшаму культурнаму чалавецтву, як загад Бога: „любі бліжняга свайго, як сябе самога". Гэта аснаўны закон і загад натуры і з ім ня можа разьмінуцца ніводзін акт арганізаванага грамадзянства, гэта жарало ладу, а нэгатыўна — жарало ўсякае крыўды іншага чалавека. Трэба нам уявіць, што ані багацьце, ані становішча не дае нам таго шчасьця, да якога ўсе мы імкнёмся. Вузкі эгоізм пхае нас да рэалізацыі шчасьця, ня гледзячы на ўсё і на

ўсіх. Дык трэба змагацца з дзіцячым эгоізмам ад першых дзён, ці калі гэны эгоізм праяўляецца ў нахіле дзіцяці ўзяць матку выключна для сябе, ці калі яно хапае для сябе ўсё, на што глянуць ягоныя вочы. Колькі мы маглі-б выкінуць шурпатасьцяў у характары адзінкі, як мы маглі-б аблягчыць ёй шлях у будучым жыцьці, калі-б узгадаваньнем выкаранілі проціграмадзкія нахілы.

Хаця галіна сэксуальнага жыцьця належыць да асобнага аддзелу гыгіены сэксуальнае, аднак зьвярну і тутака ўвагу, што нельга прайсьці моўчкі і над гэным зьявішчам у дзяцей. Умела правясьці малога чалавека скрозь гэнае складанае пытаньне — адна з аснаўных вымогаў гыгіены псыхічнае. Справа ў тым, каб ніводнае із зьявішчаў, на якое глядзіць вока дзіцяці, ня было жаралом канфліктаў, калі ня зараз, дык у пазьнейшым веку

Вядома, што дзеці неаднолькавыя. Кожнае прынясло з сабою суму нахілаў, свомасьцяў па доўгай лініі прадзедаў. Можна было-б падзяліць дзяцей збольшага на два тыпы—дзяцей вясёлых, жывых, якія лёгка ўмеюць знайсьці кантакт з асяродзішчам, з нахілам да правадырства. Такія дзеці лягчэйшыя да ўзгадаваньня. Маглі-б мы сказаць аб іх, што гэта кандыдаты на шчасьлівых. Інакш з другім тыпам дзяцей, з тымі, што маюць нахіл зачыняцца ў сабе, якія ня выказываюць усяго, што ў іх на душы. Гэныя вось, маўляў тыя далікатныя краскі, патрабуюць асаблівае зважнасьці ў адносінах да сябе. Трэба глядзець, каб іх не напалохаць, каб ня выклікаць настрою, што яны горшыя за іншых, што яны менш вартасныя. Ёсьць цэлая вялікая школа псыхолёгічная, паводле якое большая частка хворых праяваў у жыцьці дарослае адзінкі залежыць ад няўмелага ўзгадаваньня. Няўмелае ўзгадаваньне, адчасьці на асноведзі прыроднага нахілу, пакінула пачуцьцё собскае ніжэйшасьці. Гэнае пачуцьцё замінае ў нармальным разьвіцьці адзінкі, пакідае па сабе настрой, што вядзе да канфліктаў з асяродзішчам.

Змаганьне з эгоізмам дзіцячым не азначае і не пахваляе суровасьці, наадварот — патрэба найбольш далікатнасьці, мяккасьці, толькі роўнае, станоўкае. З гадамі ўзгадаваньне дзіцяці будзе што-раз больш складаным. Ніколі аднак не забывацца, што малое дзіця — гэта адзінка, і адносіны да яе хай будуць такія, як да кожнае дарослае асобы, з тою розьніцаю, што йнакш паясьняем сваё мы ў адносінах да іх становішча.

Школа накідае новыя праблемы ў датарнаваньні вымогаў псыхічнае гыгіены. Зьяўляецца тутака новы дзейнік працы, якая раней была хутчэй гульнёю, а цяпер будзе стульна злучанаю з адзінкаю—сяброўкаю да апошніх ейных дзён. Бацькі ў першую чаргу пракладываюць шлях далейшых адносінаў да працы. Задачаю іх будзе навучыць дзіця, што праца — гэта ня толькі неабходнасьць, што гэта адначасна варунак да пачуцьця собскае самацэннасьці. Кожная праца падымае на вышэйшую ступень чалавека. Праца — адзін з найлепшых лекаў на шмат якія няду-

жасьці, яна прыпынішчам ад суму, зьнеахвочаньня. Адно толькі, трэба, каб праца ня была прыметаю прыніжанасьці, каб яна была крыніцаю бадзёрасьці. У такіх адносінах да працы — жарало сапраўды дэмакратычнага ўзгадаваньня.

У школе іншыя мамэнты спагадаюць разьвіцьцю прынцыпу дэмакратызму. Дзіця мае прыродны нахіл шукаць прыязьні ў сяброў, незалежна ад іхняга роду, знатнасьці бацькоў і г. д. Ня трэба толькі спыняць і замінаць у гэным кірунку. Школа адначасна будзе паказальнікам мэтазгоднасьці нашых мяркаваньняў узгадаваўчых. Бачым, ці дзіця ідзе ахвотна да школы і адначасна вяртаецца радасна да хаты. Наглядаем, ці вочы ягоныя штораз шырэй адчыняюцца пазіраючы на сьвет, на ўсе праявы жыцьця, і падтрымліваем яго, калі бачым, што добра, ці зноў наадварот — папраўляем, памагаем ісьці далей. У школе дзіця больш ярка, чымся дагэтуль, бачыць іншы сьвет, бачыць ягоную складанасьць, вучыцца мець гатовыя формы рэакцыі на ўсе вонкавыя зьявішчы.

Вельмі важную і небясьпечную пару дасьпяваньня мінаюць дзеці, узгадаваньне якіх ішло беспамыльнаю дарогаю, бяз ніякіх асаблівых раструсак, і вось бачым перад сабою ўжо амаль не гатовага зусім чалавека, які кончыўшы навукі школьныя бярэцца да практычнага жыцьця ў нейкай прафэсыі. Выбар прафэсыі з гледзішча гыгіены псыхічнае бязумоўна вельмі важная праблема. Трэба помніць, што дзіця добра ўзгадаванае, дзіця непапсаванае, якое не аглядаецца на карысьць будучае свае працы, дзіця шчырае да свайго асяродзішча, выбярэ дарогу найбліжэйшую сваім нахілам. Гэная-ж дарога будзе адначасна найбольш карыснаю і грамадзянству, сябром якога зьяўляецца новы чалавек.

Ніколі нельга накідываць, што бацьком, апякуном здаецца найбольш карысным і важным. Бязумоўна, трэба праявіць сваё зацікаўленьне, трэба памагчы шукаць найлепшага шляху, толькі ня трэба разумець, што можна накінуць сваю волю, свае пагляды пры выбары прафэсыі. І якга нашы ранейшыя суадносіны з дзяцьмі, давер, пашана і адначасна прасьціня адносінаў аблягчаць выбар і пастанова будзе зроблена. Найчасьцей само жыцьцё дае даволі абмяжаваныя формы дзеля выбару. Скажам, дзіця земляроба найчасьцей астанецца пры зямлі, сын фаховага чалавека астаецца найчасьцей пры прафэсыі бацькі. Умовы жыцьця вялікага места больш складаныя, аднак і там заўсёды трэба помніць на адно, што ўсюды чалавек можа быць шчасьлівым, а шчасьце ў першую чаргу ў працы, якую мы любім.

Кожная прафэсыя мае сваіх характэрных прадстаўнікоў. Вядомы, скажам, тып настаўніка, афіцэра, тып судзьдзі. Тое самае наглядаецца і паміж працаўнікамі фізычнымі. Адчасьці гэта сьледамкі працы, адчасьці нахіл да дадзенае прафэсыі, свомы і прыродны чалавеку. Датарнаваньне псыхотэхнікі сучаснае да промыслу, да выбару катэгорыі высокае асьветы і практыка,

якую сяньня маем з гэных досьледаў псыхотэхнікі, паказывае, што поклік собскі да нейкае прафэсыі, калі на абаснаваньне гэнага покліку ня дзеялі ніякія мамэнты, як скажам імкненьне зарабляць больш грошаў і г. д., што вось гэны поклік і спасьцярогі псыхотэхнічныя амаль не цалком пацьвярджаюцца.

Прафэсыянальная праца — тэрыторыя дзейнасьці іншае галіны гыгіены, мяноўна гыгіены прафэсыянальнае. Паасобныя галіны гыгіены стульна з сабою спалучаныя а гыгіена псыхічная быццам тая пуцяводная зорка, лінія генеральная. У паасобных мамэнтах, у канкрэтных умовах праяўляюцца канкрэтныя вымогі аднае галіны гыгіены. І бязумоўна, гыгіена псыхічная, ейныя патрэбы будуць здаволены, калі з гыгіенаю працы будзе ўсё ў парадку. Сяньня мы зьяўляемся жывымі сьведкамі вялізарных зрухаў, пераменаў у плошчы працы. Штораз расьце вялікшая спэцыялізацыя, быццам неабходнасьць эканамічная. Кажу „быццам“ дзеля таго, што ёсьць такія „ўтапістыя“ эканамісты, якія кажуць, што якга адзінаю магчымасьцю далейшага жыцьця нармальнага— гэта парваць з тым агульным тонам, накінутым нам капіталістычнаю формаю, з тым аснаўным тонам, дзе ўсё мераецца колькасьцю зыску. Адзіным выхадам кажуць гэныя ўтопістыя—гэта вярнуцца да больш простага жыцьця. Не вырашаючы аканчальна гэнага пытаньня, трэба сказаць што ёсьць бязумоўна ў сяньняшняй цывілізацыі процінатуральны нахіл да мэханізацыі чалавека. Усё менш і менш бачым і чуем чалавека за варштатам, за сталом. Нумар, колькасьць пазыцыяў засланяе нам зусім вобраз чалавека канкрэтнага.

Ці гэта неабходнасьць гістарычная? Магчыма. Дасюлешнія нашыя ведамасьці аб чалавеку, знаёмства ягонае душы, прымушаюць сумлявацца, каб гэная надыходзячая пара новая здаволіла самае важнае, натуральнае імкненьне адзінкі быць шчасьлівым. Вось у гэным месцы роля і значэньне гыгіены псыхічнае вырастаюць асабліва высока. Яна скажа свой рашучы голас, як наладзіць арганізацыю працы, каб яна не зрабілася працаю прыганятага ды нат' яшчэ горшаю. Прыганяты незалежна ад рэзультатаў працы бачыў на сабе і жыў інтэнсыўна тою роскашу, якая ляжыць у самым выконываньні працы, дзе можна знайсьці нейкую цэласьць. Нашая ці будучая цывілізацыя пагражае адабраць і гэную індывідуальную роскаш.

Магчыма, закіне нехта, што разважаньне гэтае памылковае дзякуючы індывідуалістычнай ахварбоўцы, што да працы трэба ўмець знайсьці падыход калектыўны, масавы. Магчыма, што яно так, я кажу толькі аб сяньняшняй рэчаіснасьці. Бязумоўна і тутака можна было-б аддзяліць жыцьцё прафэсыянальнае ад асабістага, зьдзейсьненьне такога падзелу пры нашых умовах эканамічных здаецца зусім немагчымае.

Цікавую спробу наладжаньня адносінаў у плошчы вымогаў гыгіены псыхічнае наглядаем у Саветах. Вельмі там папулярны

назоў *„дзейны адпачынак“*. Характар дзейнага адпачынку вельмі блізкі да таго, што Заходняя Эўропа ведае ўжо даўно і чым карыстаецца ў адносінах да адзінкі. У Саветах гэныя загады з габінэтаў лекарскіх пайшлі ў фабрыкі, вялікія сельскія гаспадаркі. У дзейным адпачынку бачым высокі культ працы і адначасна сьцьверджаньне, што ня толькі мучае сама праца, колькі характар гэнае працы, нашыя суб'ектыўныя да яе адносіны. Ведаем, што людзі ня то што месяцамі а ўсё жыцьцё працуюць бяз ніякага адпачынку, быццам ня ведаючы аб існаваньні 8-мі гадзіннага дня працы, і яны ня мелі ніколі магчымасьці спытацца сябе, ці мо' яны нешчасьлівыя. Ня пыталіся сябе з тае прычыны, што ім было зусім добра. Калі-б нехта хацеў разумець вялікую здабычу грамадзкую — 8-мі гадзінны дзень працы — ў тым сэнсе, што чалавек сапраўды нічога не рабіў-бы, апрача яды і сну ў гадзінах свайго адпачынку, дык гэта была-б памылка псыхолёгічная і памылка ў плошчы гыгіены псыхічнае.

Чалавек тымбольш шчасьлівы, чым шырэйшы кантакт ягоны з жыцьцём. Якая, прыкладам, розьніца паміж чалавекам культурным, інтэлігентным а бедным з аднае стараны, а багатым ды за тое бяз ніякае культуры. Багатыр ведае вартасьць грошаў вельмі аднабока, ня ўмее ён іх выкарыстаць на нішто іншае, як ежу, смашныя напіткі, скажам яшчэ на прыгожую вопратку і хатнюю абстаноўку. Самыя грошы не пашырылі ягонага кругавіду, ня збольшылі колькасьці і багацьця ягоных перажываньняў. Ніхто ня будзе спорыць, што грошы вельмі важны мамэнт пры сяньняшнім ладзе эканамічным, як спосаб пазнаёміцца з жыцьцём, ягонымі правамі, аднак яны не роўназначныя з пашырэньнем плошчы жыцьцёвае ўласьніка грошаў. Сьвет, жыцьцё растуць і пашыраюцца дзеля нас настолькі, наскольні зрабілі мы ўклад працы, каб бліжэй пазнаёміцца з ягонымі праявамі, зьместам вельмі рознаякім і багатым.

Дык вось дзейны адпачынак будзе рэалізацыяю такіх адносінаў да жыцьця. Адпачынак—гэта ня гультайскае нічоганяробленьне. Адпачынак у Саветах урэгуляваны, прысьвечаны ён на грамадзкую працу, на чытаньне кніжак, на ўзгадаваньне і разьвіцьцё мастацкіх нахілаў, на спорт, на тварыскае жыцьцё і г. д. Адно толькі нас „індывідуалістых“ магло-б палохаць, што там у Саветах на ўсім ёсьць штамп афіцыяльны, няма здаецца месца на пачын індывідуальны, пачын адзінкі. Гэты апошні мамэнт не аснаўны. Прынцып сам па сабе вельмі і магчыма нат' адзіна правільны.

Штодзенная праца, асабліва ў прафэсыях ня выклікаючых больш жывога зацікаўленьня (нажаль заўсёды будуць і такія прафэсыі) патрабуе адплаты. Сама грашовая ці іншая плата яшчэ замала, каб здаволіць усе цікаваньні працоўнае адзінкі. Бязумоўна, сказу гэнага ня трэба разумець такім спосабам, што кожная адзінка будзе актыўна займацца музыкаю, малярствам ці

іншаю праяваю і формаю мастацтва, ня кожны будзе належаць да хору, ці скакаць на некалькі мэтраў угару. Хачу сказаць толькі тое, што нельга абмяжавацца да вузенькае галіны зацікаўленьняў, інакш хутка пачнём душыцца.

IV

Вышэйсказанае тарнавалася да паасобнага чалавека. Сяньня ня можам астаючыся ў гэнай плошчы пакінуць на старане праяваў жыцьця грамадзкага. Сяньня немагчыма аддзяліць чалавека ад улоньня грамады, у якой ён жыве. Дык гыгіена псыхічная ідзе за работнікам у фабрыку, за ўсімі працаўнікамі ў канторы, усякія іншыя публічныя ўстановы. У гэных масавых установах трэба ў першую чаргу наладзіць патрэбныя ўмовы гыгіенічныя. Нажаль трэба сказаць, што сапраўднасьць вельмі далёкая ад ідэалу. Ды што казаць аб нейкіх ідэалах, калі сяньня перажываем пару эканамічных непарадкаў, якую мы завем крызысам, а ў гэным крызысе вялізарныя арміі безработных стаяць і чакаюць працы абыякое, каб мець толькі кусок хлеба; ніхто з іх ня будзе дамагацца ніякае гыгіены, калі-б нат' і ведаў ды разумеў вымогі гыгіены псыхічнае. Ды нат' тыя, што маюць забясьпечаны кусок хлеба на сяньня і на заўтра,—ці яны сапраўды свабодныя ў сваіх дамаганьнях? Кожны з іх ведае, што заўтра можа яму не хапіць работы і ён апынецца ў радох безработных. Гэныя зьявішчы ды агулам атмосфэра сучаснае эпохі, эпохі, якая поўніцца лёзунгамі ненавісьці сацыяльнае, нацыянальнае, расавае, калі адзінка захопліваецца крыўдаю, няпраўдаю, дзеля таго, што ягоная група праводзіць гэныя крыўдныя, ненавісныя праўды. Уся нашая пара поўная захопленьня словам, адначасна пара бязверра ў слова, слова сяньня лішне часта робіцца знадворнаю вопраткаю, каб схаваць сапраўдны зьмест рэчаіснасьці. Людзі ня вераць у праўду, хараство. Дык ці ня будзе няпрыгожым жартам гаварыць аб гыгіене псыхічнай на такой беспатольнай асноведзі сучаснага дня?!

Ня зусім безнадзейная аднак нашая сапраўднасьць. Мо без агульнага пляну, несыстэматычна, аднак праводзяцца дамаганьні гыгіены, часта само жыцьцё ня гледзячы на ўсё вядзе да лепшых формаў. Бязумоўна, важнаю здабычаю будзе датарнаваньне псыхолёгіі практычнае да выбару прафэсіі, вялікаю здабычаю будуць амбуляторыі пераджанімскія, процігарэлачныя, амбуляторыі для псыхічна хворых. Здабычаю будзе імкненьне інфармаваць найбольш шырокія масы аб пытаньнях з агульнае сацыялёгіі, эканомікі, мэдыцыны, асабліва з галіны гыгіены агульнае і гыгіены псыхічнае. Адно толькі, што пакуль усімі гэнымі пытаньнямі будуць займацца адумыслоўцы, пакуль яны не зацікавяць шырокіх гушчаў насельніцтва, а ў першую чаргу інтэлігенцыі народнае, датуль гэта будуць дробныя спробы без ніякіх сьледамкаў па сабе больш вызначных.

Нашыя беларускія умовы мо' больш як у каго другога бязрадасныя. Гаварыць аб гыгіене псыхічнай нашаму селяніну, нашаму галоднаму інтэлігенту—гэта сапраўды няпрыстойны жарт — так сказаў-бы нехто. Яно аднак ня зусім так. Нікому ніколі не пашкодзіла, калі ён лепш паглянуў на сваю сапраўдную праўду жыцьцёвую. Іншая справа, што нам вельмі цяжка пры нашых канкрэтных умовах рэалізаваць вымогі ...гыгіены псыхічнае. Вывад адзін толькі,— што трэба натугі, натугі вялікае, каб умовы перамяніць на лепшыя.

Др. Ст. Грынкевіч

У дарозе

Спаткаў я вёску сумную,
знаёмую сваю.
Ці ёсьць тут шчасьце, думаю,
ці часта тут пяюць?...

Спаткаў яе я шэраю
васеньняю парой
і з жаласьцю бязьмернаю
прыстаў я пад гарой.

Калі к табе ня еду я,
калі я ня іду, —
ты сумная і бедная,
ўрасла у лебяду.

Хацеў-бы думкай сьмелаю
прыйсьці і пaглядзець, —
ну ўся зямелька белая:
пазнаюць, хто ідзе.

А гэтак мне ня хочацца,
каб відзелі усе,—
цяжэй тады варочацца
па сьнегавой расе.

Г. Новік.

Няведамы беларускі паэт

Чытаючы харошую кніжку Міхала Яніка *Гісторыя палякоў на Сыбіры* („*Dzieje Polaków na Syberji*". Kraków 1928), натрапіў на некалькі бачынаў, у якіх гаворыцца аб няведамым дасюль беларускім паэту *Францішку Савічу*. Ці аднак быў ён беларусам, у сяньняшнім значэньні гэтага слова? Думаю, што найменш такім, як Каліноўскі і Грыневіцкі, а мо' і большым. Заслужаны аўтар твораў аб сыбірскім краю, Агатон Гільлер, кажа, што палітычны выгнаньнік на Каўказе Францішак Савіч „складаў вершы ў беларускім языку" (Янік, 272). Галоўным жаралом да яго гісторыі ёсьць выдадзеная Э. Гэльленіям (Іваноўскім) зборная праца *Успаміны з мінулых гадоў* („*Wspomnienia lat ubiegłych*"), дзе ў томе II (бач. 187—239) надрукаваны *Мэмуар Савіча* („*Pamiętnik Sawicza*). Вось што аб гэтым кажа Янік:

„*Мэмуар Савіча*, брата орэнбурскага выгнаньніка Норбэрта, ёсьць з часоў Канарскага. Мала ў ім, праўда, аб Каўказе, больш аб справе Канарскага. Браты Савічы (Францішак і Норбэрт) нарадзіліся ў пінскім павеце. Бацька быў уніяцкім ксяндзом. Асірочанымі заняўся прэфэкт пінскай школы, ксёндз Францішак Махцінскі. Калі скончылі школу сярэднюю ў Пінску, апякун выслаў іх у мэдыцынскую Акадэмію ў Вільні".

„Калі ў гэтую-ж акадэмію ўступіў Францішак Савіч, будучая душа духа(!?) акадэміі і страх дэспатычных уладароў, — піша ў сваіх успамінах із студэнцкіх гадоў *Дух віленскай акадэміі* („Duch akademii wileńskiej) др. Мацей Лавіцкі — стаўся для моладзі другім Занам. Здружыўся з Янам Загорскім, Казімірам Рапчынскім і Мацеям Лавіцкім, каторага калегі празывалі Лук'янам, разам зарганізавалі тайнае таварыства, падзеленае на дзесяткі, і пачалі ажыўленую дзейнасьць. Аддзейвала на іх Дэмократычнае Таварыства, разважалі падаваныя гэтым таварыствам праблемы... Разглядалі цяпер справу вольнасьці і роўнасьці, скланяючыся да радыкальнай разьвязкі... „Выяжджаючы на канікулы, некалькі ўжо мела намер *дзеяць на сялян* (падч. наша) і на што пападзе, бо чулі аб ахвярнасьці многіх разважных людзей, *што запісываліся да сялянства* (падч. наша), каб пад прыкрыўкай сярмягі лягчэй было пашыраць збаўленныя хрысьціянскія мыслі эўрапэйскіх народаў..."

„Хаўтуры „белага голуба" Язэпа Сьнядэцкага*) далі Вільні і моладзі аказію да маніфэстацыі (у сьв. Яна). Кс. Людвік Трынкоўскі**) сказаў палкую прамову. На хаўтурах быў Канарскі, аб чым ведаў Савіч. Расхваляваная энтуз'язмам моладзь пастанавіла пачаць прапаганду сярод рамесьнікаў. Рапчынскі, Загорскі і Кракавянін (sic!) Александар Грыцыкевіч (хіба Украінец?) мелі намер залажыць між імі таварыства ў духу гмінаўладзтва(!). Спаткаліся з надзвычайным прыняцьцем, бо гэтыя „хлопцы, на крыльлях свабоднага духа ў настрою ўдзячнасьці і брацкай пашаны пабеглі да Рапчынскага... із словамі радасьці і шчасьця цалавалі яму рукі і твар..." Праз прадстаўнікоў, моладзь увайшла так-жа ў сутычнасьць з існуючым у Вільні грамадзянскім Палітычным Таварыствам, да якога належаў кс. Трынкоўскі, і якое ўтрымлівала зносіны з Канарскім.

„Аж раптам зваліўся гром. Віленскія таварыствы, згуртаваўшыся пры прапагандзе Канарскага, ня трымаліся патрэбнай асьцярожнасьці, мелі зашмат утаемнічаных. Калі расейскі ўрад выкрыў змову, Савіч (Францішак) апынуўся з іншымі ў вастрозе. Трубецкі (садыст, княжацкай крыві царскі сатрап) мучыў яго голадам, кіямі і бязсоннасьцю. Раз, калі спаў, ударыў яго па твары, а тады Савіч нібы заспаны так яму дакладна аддаў, што князь пакаціўся ў кут. Дзеля гэтага яшчэ больш жорстка зьдзекаваўся над няшчасным, мучыў яго праз цэлыя месяцы голадам, і ў розным часе прыказаў даць яму разам дванаццаць тысяч кіёў. Міма гэтага Савіч вытрывала маўчаў. Тады прывязьлі з Варшавы Антона Малэцкага, каторы ўсё выказаў. Зараз-жа быў прыгавар. Францішак Савіч прыгавораны ў салдаты на Каўказ. Выязджаючаму шляхотная патрыётка „сястра Ганна" ўручыла клумак з рэчамі, бялізнай і грашмі. Разам з ім ехалі: Ян Загорскі і Ян Мілескі.

„У дарозе захварэў на жаўтачку. Затрыманы ў нейкім шпіталі, здрушыўся з Пэрсам Алім, каторы яму даў пісьмо да прыяцеля ў Тыфлісе, каб з яго мог скарыстаць, калі будзе патрэба. Як паправіўся, празначылі яго ў войска ў Кізляр. Адтуль уцёк у 1842 г. і падчас многіх прыгодаў, у якіх пісьмо Аляга сталася вельмі прыдатным, дастаўся шчасьліва ў родную старонку. Тут прабываў у Бярдычаўшчыне пад прозьвішчам Гэльляга. — Гільлер кажа, што зваўся Элігім, — займаўся фэльчэрствам, быў дабрадзеям народу і — як сказана вышэй — складаў у беларускім языку вершы. Гэльлені піша, што Савіч прад сьмерцяй выявіў паэту Александру Грозе сваё прозьвішча.

„Францішак Савіч быў гарачым спагаднікам вясковага народу. Гэтае пачуцьцё атрымаў у бацькаўскай хаце, а ўзмоцніў яго падчас студэнцкіх студыяў, пад уплывам лектуры і прапаганды Канарскага. Прычыну заняпаду і падзелу Польшчы бачыў у крыўдзе, спрычыненай сялянству. У змове Канарскага цаніў *наўперад імкненьне да папраўы крыўды і скасаваньня паншчыны*" (падч. наша, 270—272).

Агулам Беларусы сярод палітычных выгнаньнікаў (па 1830 і 1863) былі заўсёды і ўсюды. Аб Сыбіры Янік кажа: „У масе ахвяраў за справу вольнасьці Польшчы знайшлося так-жа *даволі многа прадстаўнікоў беларускага насельніцтва...*, што астанецца па гэтым пэрыядзе прыгожым і навучальным назаўсёды ўспамінам" (280).

*) Сын ведамага мэдыка і хіміка праф. Андрэя Сьнядэцкага; быў пазьней маршалкам шляхты.

**) Дохтар сьв. тэолёгіі і віленскі канонік, знамяніты віленскі красамоўца. Умешаны ў справу Канарскага, памёр выгнаньнікам на Сыбіры.

© PDF: Kamunikat.org 2013
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2013

Вясной 1864 г. сядзеля ў вастрожнай цэлі бэрнардынскага кляштару ў Беларускім Менску „Каміля Марцінкевічанка, дачка аўтара *Гапона* і перакладчыка на беларускі язык *Пана Тадэўша,* якая, выгнаная ў Солікамск, выйшла там замуж за д-ра Казімера Асіповіча і вярнулася на бацькаўшчыну ў 1880 г.“ (бач. 370).

Гаворачы аб гэтых выгнаньніках варта таксама ўспомніць аб гэтак бліскім Беларусам імяні Яна Чэчата, каторы, па прыгаворы на філяматаў, 10(22) кастрычніка 1824 г. быў з Вільні вывезены на далёкі ўсход, у падуральскую Уфу. Было тактыкай Чэчата ўтрымліваць з расейцамі толькі канечныя адносіны (103),— насупроць іншых выгнаньнікаў, як напр. Тамаша Зана, каторы іх ня чураўся і пазваляў сабе ўсюды і заўсёды выказываць голасна ўлюбленыя ў душы праўды. У Уфе Чэчат вучыў задарма пісаньня, чытаньня і арытмэтыкі дзяцей губэрнатара, рэшту часу аддаючы далейшаму ўласнаму навучаньню. Вярнуўся на бацькаўшчыну першы, ужо ў 1837 г. (там-жа).

„Розныя адносіны Зана і Чэчата да расейскага таварыства прыняў пад увагу Міцкевіч. У пісьме з 1827 г., пісаным да абоіх прыяцеляў, жартуе: „...Мой Янка!.. (да Чэчата). Не падобны-ж да сталавіцкіх хлапцоў, што б'ючы кожнага жыда хацелі памсьціць за ўкрыжаванага Хрыста?... Каб Табе яшчэ зацытаваў біблію, скажу Табе шчыра, што, калі галодны, ня толькі гатоў есьці трэфны бэфштык Моабітаў, але нават мяса з аўтара Дагона і Бааля, — і дзеля гэтага, як быў, буду добры хрысьціянін“... Здаецца, што гэтае пісьмо зьмяніла паступаньне Чэчата, у кожным выпадку так можна думаць на падставе пісьма Зана да Малеўскага, у якім гаворыцца: „Ведаю із стараны, што (Чэчат) здароў; сталовы начальнік(!), добра і весела(!) жыве, а некалькі нейкіх прыбыўшых з Уфы хвалілася ягоным дружствам(!)...“ (там-жа).

Так жылі на выгнаньні беларускія песьняры, — моцныя духам, няўступчывыя перад расейскім урадам і заўсёды верныя сваей Бацькаўшчыне.

Цыпрыян Красоўскі

На шляху творства беларускіх культурных цэннасьцяў

Адраджэньне народу вымагае дзьвюх рэчаў.

Перад усім — прабуджэньня сьвядомасьці ў масах і цьвёрдае волі гэтых масаў жыць самастойным нацыянальным жыцьцём.

Але гэта — толькі адзін бок мэдалю. Ня менш важна тое, каб народ — праз сваю нацыянальна-сьведамую інтэлігенцыю, неразрыўнымі вязямі злучаную з масамі, — тварыў новыя культурныя цэннасьці, падымаючы ўсё вышэй культурны ровень свайго грамадзянства і адначасна ўзбагачываючы сусьветную культурную скарбніцу.

Збуджаная нацыянальна маса фізычнай сілай можа здабыць сабе права на жыцьцё. Але захаваць гэтае права, здабыць сусьветнае прызнаньне і гэтым зябясьпечыць сабе нацыянальную будучыню можа толькі творчая праца нацыянальнае інтэлігенцыі.

Калі пачынаўся беларускі адраджэнскі рух, дык павадыром яго лёгка было дагледзіць актывізацыю масаў, якія будзіліся зосну ў сувязі з тымі масавымі народнымі рухамі, што ахапілі ўвесь бязьмежны прастор Расейскае Імпэрыі на самым пачатку нашага стагодзьдзя. Праўда, гэны рух меў характар палітычна-соцыяльны. Але ў сувязі з ім у беларускіх масах будзілася пачуцьцё *чалавечае годнасьці.* Масы беларускія захацелі — паводле ўдалага выражэньня Купалы — „людзьмі звацца“. А разам з пачуцьцём чалавечае годнасьці мусіла збудзіцца і пачуцьцё *нацыянальнае годнасьці, нацыянальнае самапашаны:* бо-ж беларускія масы ад вякоў захоўвалі непарушна сваю мову, свае песьні, свае звычаі, — сваю нацыянальную душу. На ўсё гэта „моцныя гэтага сьвету“ глядзелі з пагардаю. Але ў душу беларускага селяніна не залазілі. Народ шанаваў сваё роднае ў сілу нясьведамае традыцыі. Калі-ж збудзілася людзкая і нацыянальная сьведамасьць, беларускі адраджэнскі рух глыбака пранік у масы і павёў іх на новыя шляхі.

Адна частка заданьня беларускіх адраджэнцаў была выпаўнена даволі лёгка. Другая здавалася труднейшай. А сьведамасьць гэтае труднасьці шмат каго паўстрымлівала ад чыннае працы дзеля беларускага адраджэньня. Людзі проста на верылі ў магчымасьць творчае культурнае працы ў беларускай мове і ў беларускім духу.

Але тыя, што паверылі і пайшлі па беларускім адраджэнскім шляху да канца, правільна паказвалі на тое, што беларуская інтэлігенцыя, здольная да тварэньня нацыянальных культурных цэннасьцяў, існуе, толькі-ж яна расьцярушана сярод чужых грамадзянстваў. Бо-ж з беларускага нацыянальнага караня выраслі такія волаты мысьлі і слова, як Адам Міцкевіч і Дастаеўскі, як слаўныя музыкі-кампазытары Манюшка і Глінка, як чысьленыя прафэсары і навуковыя працаўнікі, узбагачываўшыя пе-

раважна расейскую навуку, хоць з паходжаньня, а часта і сьведама былі беларусамі (прэзыдэнт пецярбурскае акадэміі навук Карскі, прафэсар Даўнар-Запольскі і г. д.). Усе гэтыя творцы *чужое* нам культуры, ясна-ж, паказвалі на тое, якая вялізарная творчая сіла крыецца ў спарадзіўшым іх беларускім народзе, каторы надзяліў іх іхнімі здольнасьцямі. Дык чаму-ж тыя новыя культурныя працаўнікі, якія, выходзячы, як і гэныя, з беларускае гушчы, толькі-ж ня губляючы ні сувязі з сваім народам, ні роднае мовы, — чаму-ж яны ня здолеюць творы свае мысьлі, свайго генія апранаць у родную беларускую вопратку?

Вера павадыроў беларускага адраджэньня ў поўнай меры апраўдалася ў блізкай ужо будучыні. Першыя даказалі, што народ наш здольны да тварэньня новых скарбаў культуры, роўнацэнных з культурнымі скарбамі другіх народаў, *беларускія паэты.* На грунце народнае паэзіі вырасла новая — індывідуальная паэзія, якая стаіць ня ніжэй за паэзію перадавых культурных народаў сьвету. Імёны Коласа, Купалы, Багдановіча і іншых — ведамы па ўсей Эўропе. Калі ў 1935 годзе ў Парыжу адбываўся міжнародны кангрэс пісьменьнікаў і літаратараў у абароне міру і культуры, дык сабраныя там найвыдатнейшыя прадстаўнікі францускае, нямецкае, англійскае і іншых эўрапэйскіх літаратур найбольш горача віталі выступленьне беларускага паэта Коласа, які запраўды даў сьвету новыя вартасьці. За Коласам і Купалай у працягу трыццацёх гадоў нарасталі новыя беларускія песьняры — гэткі чысьлены на Ўсходзе „маладняк". Але і Захад, ня гледзячы на цяжкія варункі тутэйшага жыцьця, не адстае ад Усходу. На нашых вачох і тут нарасьлі новыя паэтыцкія сілы—Натальля Арсеньнева, Міхась Машара, Васілёк і інш. а цяпер раптам буйным цьветам расьцьвіла творчасьць Максіма Танка, якая ня толькі зразу-ж зраўнялася з творчасьцяй корыфэяў беларускае паэзіі, але й павінна перарасьці яе.

За паэзіяй ідзе беларуская музыка — беларуская песьня. Аб нязвычайным багацьці беларускае народнае песьні ведама ўсім. Гэтае багацьце стараліся паказаць сьвету арганізатары беларускіх хораў, беларускіх канцэртаў і музыкальных вечароў. З яго пазычалі матывы да сваей арыгінальнай творчасьці чысьленыя кампазытары нашага Краю — і свае, і чужыя: Карловіч, Рагоўскі, Казура, а ў найнавейшыя часы — Грэчанінаў, Аладаў, Галкоўскі і г. д. Урэшце прыждалі мы выступленьня на міжнароднай арэне мастакоў-пяюнеў, якія, маючы цудоўны голас і артыстычную душу, найлепш выявілі хараство народнае песьні, мастацкім выпаўненьнем падыймаючы яе на недасяжны дагэтуль ровень. Першае і найвыдатнейшае імя ў гэтай галіне — гэта імя Міхала Забэйды-Суміцкага, шырака ведамага і сярод беларусаў, і ўва ўсей Польшчы, і ў Заходняй Эўропе.

Не адстае і беларускі тэатр, а пры ім — балет беларускі. У Менску і Віцебску беларускія дзяржаўныя тэатры стаяць на роўні слаўнага на ўвесь сьвет тэатру маскоўскага.

Урэшце — расьцьвітае беларускае малярства. На Усходзе ёсьць ужо цэлая чарга беларускіх мяляроў-мастакоў, творыцца асаблівая беларуская малярская школа. На Захадзе маем гэтак сама рад выдатных мастакоў у гэтай галіне творчасьці: Сергіевіч, Сеўрук, Чурыла, гадунцы віленскага унівэрсытэту, выбіваюцца тут на першыя мясцы.

Зьдзейсьнілася ўрэшце і лятуценьне першых павадыроў беларускага адраджэньня аб стварэньні беларускае навукі — ў роднай языковай вопратцы. На Усходзе існуюць беларуская акадэмія навук, унівырсытэт і спэцыяльныя вышэйшыя школы, кансэрваторыя, школы малярства, драматычныя студыі. Беларускія навукоўцы выступаюць на міжнародных навуковых кангрэсах, і ўвесь культурны сьвет з глыбокім зацікаўленьнем сочыць за іх творчай працай на ніве навукі.

Усе гэтыя нашы здабычы ў галіне мастацтва і навукі ўзбагачываюць ня толькі беларусаў, падыймаючы ровень нашае нацыянальнае культуры, але і ўзбагачываюць культуру сусьветную. Беларусы ўвайшлі ўжо ў сям'ю народаў, якія твораць скарбы сусьветнае культуры, і з кожным годам замацоўваюць тут належнае ім месца.

Л. С.

На службе вокальнага мастацтва

— Цудоўная песьня — творчая стыхія беларускага народу, якая да апошніх часоў ня выходзіла паза межы свайго народга абшару і да якой зацікаўленьне абмежвалася блізу што толькі габінэтам вучонага людаведа, у нашы дні пачынае шырока разьліівацца па ўсім сьвеце, захопліваючы ўвагу прадстаўнікоў вышшае музыкальнае культуры... — так пачынае сваю стацьцю-рэцэнзію аб канцэрце Паўла Прокопені ў № 104 віленскай расейскай газэты гр. Сіріус, які не аднойчы ўжо забіраў голас у справе беларускага культурна-нацыянальнага адраджэньня, відаць блізкай яго сэрцу. У свaім часе ён горача вітаў слаўнага расейскага кампазытара Грэчанінава, які на схіле веку аддаў блізу цалком сваю творчую душу апрацоўцы беларускай народнай песьні; цяпер ён таксама шчыра вітае і першых сьпевакоў, якія на нашых вачох выходзяць на сусьветную арэну ўсьлед за беларускай песьняй.

Запраўды-ж, — трэба лічыць азнакай нашых часоў тое, што ня толькі беларускае народна-песеннае творства, але й нашыя сьпевакі, кампазытары й выканаўцы, пачынаюць выступаць **пад сваім уласным беларускім імем**, не хаваючыся пад чужымі сьцягамі і назовамі.

Тры рознага характару сьпевакі выйшлі на нашых вачох з заходняе часткі абшару беларускае песьні. Першага, старэйшага з іх, Сяргея Усьцімовіча, які здабыў сабе ўжо даўно славу **пад імем Бэноні,** добра ведае беларускае грамадзянства. Не аднойчы выступаў ён з беларускімі песьнямі і рамансамі на эстрадзе віленскае гімназіі. Гэта магутны бас багатага тэмбра, паважны, цалком аддадзены любімаму мастацтву артыст, усьцяж працуючы над сабой, тэхнічна і духова ўздымаючы ўсё на вышэйшыя ступені сваю нязвычайна багатую абдараную Богам прыроду. Апошняе выступленьне яго на сьвяце „Дня Расейскай Культуры“ задзівіла нават яго сталых адаратараў, якім здавалася, што далей у дасканаласьці любімаму сьпеваку ісьці было ня трэба і немагчыма. Запраўды, волат па стыхійнай сіле голасу і наагул „натуры“, Бэноні, як сказана, усьцяж расьце, абрабляе сябе, як артыст, шукае канчальнай формы для сваей індывідуальнасьці. Дасягненьні яго вялізарныя, даючыя мастацкую радасьць. Але — на яго творчым шляху да **ўласнай артыстычнай індывідуальнасьці стаіць... магутны, непераможны ўплыў Шаляпіна**, незраўнанага, непаўтарымага, — бо-ж геніяльнага — расейскага сьпевака... Бэноні „ўспадкаваў“ рэпэртуар Шаляпіна, але разам з тым ня мог не ўспадкаваць і яго „манеру“. Пасьля Шаляпіна **па-свойму** пяяць яго рэпэртуар зможа толькі геній, роўны яму самому..

Можа ў гэтым **ня-вольным упадабняньні расейскаму сьпеваку,** хоць і геніяльнаму, з **боку беларускага з прыроды, з крыві і косьці** артыста і **ляжыць тая перашкода на шляху шляхотных, магутных, напалавіну нават пераможных — імкненьняў яго да цалком уласнага артыстычнага твару...** Але-ж такі заўсёды **«ўплыў уплыву»**, такі заўсёды **«закон упадабняньня»...** Яно памагае маладому артысту шукаць уласнай дарогі, „ідучы шляхам генія“, як кажа Пушкін, памагае „вызваленьню“ яго таленту з путаў прыроды. Але артыст павінен урэшце сам вызваліцца з гэтай зваліўшай яго сілы, якая споўніла ўжо сваю задачу... Нядарма-ж, ведамы англійскі заканадаўца эстэтыкі абсалютнай індывідуальнасьці, Оскар Уальд, з уласьцівым яму стылем парадоксу, сказаў, што — „добрых уплываў на мастака наагул ня бывае: усялякі ўплыў — „немаральны“...

Можа, якраз фатум Бэноні — ў тым, што ён, па прыродзе беларус, ня мае яшчэ для сябе ўласнага культурна-нацыянальнага **беларускага**, у якім-бы магла разьвіцца да канца яго буйная творчая высока артыстычная індывідуальнасьць, перамогшы ўсе нават дабрадзейна дапамогшыя ей у яе разьвіцьці ўплывы, **бо-ж толькі праз свой уласны нацыянальна-народны сьвет можа дайсьці творчая адзінка да поўні агульна-людзкай красы, у сынтэзе якіх і можа толькі знайсьці і поўную ўласнай індывідуальнасьці...**

Другі сьпявак, які толькі нядаўна зьявіўся на нашым мясцовым грунце, гэта Павал Прокопені, ці правільна — Пракапеня. Гэта значна слабшы сьпявак — і як голас, таксама бас, і як артыст. За яго кажа тое, што ён — яшчэ вельмі малады, мае толькі 26 гадоў. Матарыял яго голасу — даволі добры, багаты. Але па культуры, як агульнай, таксама спэцыяльна музыкальнай, яго ня можна нават раўнаваць з Бэноні. У яркую процілежнасьць з Бэноні, — яго „пагарда“ да Шаляпіна, якую ён выказываў голасна на канцэрце апошняга ў Вільні... На гэтым шляху ляжаць найбольшыя небясьпекі для артыстычнага разьвіцьця нашага мастака сьпеву. Яму трэба шмат працаваць над сабой наагул, над сваім музыкальным разьвіцьцём, без чаго нават геніяльна абдараныя прыродай таленты хутка „мялеюць“ ці „садзяцца на мель“... „Прызваньне артыста“ вымагае ад „прыроднага чалавека“ вялікай ахвяры, вымагае сталай, усьцяж бяззспыннай працы, мала таго — нават у пэўным сэнсе „подвига аскета“... Гэта добра разумее Бэноні, высока культурны артыст, але гэта, здаецца, зусі не зразумеў яшчэ Прокопені. Свой трудны шлях, часам нават крыжовы, артыста, ён, як здаецца, залішне хутка і лёгка хоча, як кажуць, „усыпаць рожамі“, пераатварыць у „сплашную вечарыну“...

І ў гэтым — другая, ня менш грозная, небясьпека для гэтага маладсга, а нажаль не папаўшага ў адпаведнае культурнае асяродзішча артыста...

Павінны тутака сказаць яшчэ і аб трэцяй небясьпецы, пагражаючай яму, сказаць, ужо — з нашага беларускага пункту гледжаньня.

Як адзначаў ужо і Сіріус у расейскай прэсе, абодва гэтыя нашыя мастакі — беларусы з крыві і косьці, — не зьяўляюцца, нажаль, таксама беларусамі з **духу.** На гэта — ясна-ж, ёсьць свае магутныя об'ектыўныя, гістарычныя варункі. Але **варункі гэтыя зьмяняюцца на нашых вачох — на карысьць беларускай культуры ва ўсіх яе галінах.** Але абодва гэтыя нашыя мастакі неяк асталіся на баку ці ў тылу гэтае вялікай вагі эволюцыі нашых дзён. **Абодва яны хаваюць неяк сваю беларускасьць на грунце ня толькі тутэйшым польскім, але і на грунце міжнародным...**

„Калісьці, яшчэ да вайны, піша Сіріус", нашых „малороссов", цяпер украінцаў, называлі „італьянцамі славянства" — за іхнія песьні. Як бачым, цяпер і беларускі народ пачаў раджаць сваіх „італьянцаў"... Мы ведаем, што ў „залаты век" беларускай гісторыі адбывалася жывое культурна-артыстычнае яднаньне паміж Беларусяй і Італіяй, якое стварыла рад мастацкіх твораў, прыкладам, у царкоўнай архітэктуры. Нешта падобнае адбываецца ў нашыя дні ў галіне музыкальна-мастацкай: беларуская музыкальная стыхія атрымлівае тэхнічнае „афармленьне" ў італьянскай школе, і — ў выніку такое сынтэзы — ствараюцца артысты-мастакі, як Бэноні і Прокопені, якія выходзяць на сусьветную арэну"...

Але толькі вось, у гэтай **сынтэзе беларускага элемэнту з італьянскім не павінен траціцца беларускі...** Бо-ж тады, тады — ня будзе гэтай **сынтэзы.** Ня будзе гэтага **творчага жывога «зьліцьця»...** Трэба, каб нашыя слаўныя „італьянцы" не забываліся аб тым, што яны спароджаны беларускім сьветам... Каб яны перадусім не выракаліся свайго беларускага імя...

Асабліва-ж гэта трэба сказаць „Прокопені", які, хацяі значна „абрусеў", адарваны ад бацькаўшчыны змалку на далёкім расейскім Паволжы, але захаваў свой беларускі тып блізу цалком. Таму ў яго „ўстрыманьне" ад беларускага рэпэртуару на канцэртах, прыкладам, у Вільні, ці на Палесьсі, дзе ён канцэртаваў, носіць характар нейкі зусім „спэцыфічны"...

Трэці сьпявак, рэзка розьнячыся ад гэтых двух басоў—Бэноні і Пракапені, — тэнар Забэйда-Суміцкі. Першы раз выступіў ён у Вільні на наладжанай тутака ў мінулым годзе ў часе Каляд урачыстасьці — „Дня Беларускае Культуры".

Ужо на першае выступленьне артыста мясцовая прэса — беларуская, польская і расейская — адгукнулася з вялікай увагай. Адзначалася высокая школа артыста. Сёлета ў сярэдзіне траўня артыст ізноў адведаў Вільню, ужо на даўжэйшы час, і даў тутака два вялікія канцэрты, якімі на заўсёды цалком захапіў і перамог — ня толькі шырокую публіку, у першую чаргу, зразумела-ж, — беларускае грамадзянства, але і найпаважнейшых музыкальных знаўцаў і крытыкаў нашага наагул вельмі музыкальнага места.

Ня маем магчымасьці тутака даваць, нават у скароце, усіх рэцэнзіяў на яго канцэрты. Дамо толькі некалькі адрыўкаў з ацэнкі, дадзенай нашаму мастаку на балонках мясцовай расейскай газэты. Трэба сказаць, аднак-жа, што ў сваю ацэнку расейская газэта ўлажыла шмат да нашага артыста шчырага спогаду, падчырківаючы яго **беларускасьць,** якую ён не хавае, а наадварот — сам выяўляе.

Канцэрты М. Забэйды-Суміцкага паказалі нам яго голас ува ўсей поўні, а мастацтва сьпевака — у ўсей яго дасканаласьці. Артыст чараваў, захопліваў, перамагаў — з тэй запраўднай уладай мастацтва, якая завалодывае душой без найменшага гвалту над ей, даючы, наадварот, ей, пераможанай красой, сьветлую радасьць свабоды... Такое заўсёды дзеяньне запраўднага мастацва... Выкананьне праграмы было, мала сказаць — беззаганным: яно было творча-дасканалым, яно дапаўняла, дарабляла твор кампазытара, падыймала яго на вышыню няведамую самому яго тварцу. Так выконываць замыслы кампазытара можа толькі артыст, які зьяўляецца сам тварцом-мастаком, узброеным ува ўсе сродкі высокай музыкальнай культуры. Дый якраз гэтае задзіўляючае валаданьне сваім прыродным інструмэнтам, якому італьянская школа дала „крэмонскую"*) чысьціню і мілагучнасьць, — складае галоўную сілу нашага мастака.

Гэтая асаблівасьць артыста прыдае яго выкананьню характар выняткавае „сьведамасьці", інтэлектуальнасьці, мастацкай цьвярозасьці, якая на першы слух можа паказацца нават „недахопам тэмпэрамэнту"... Але справа ў тым, што тэмпэрамэнт артыста закаваны ў срогія шлюзы і грані школы, мастацтва... Адсюль — запраўды-ж — нейкі характэрны для артыста „эсцэтычны налёт" на ўсей яго мастацкай індывідуальнасьці, так захопліваючы, гармонізуючы з „матавым" тэмбрам яго голасу. У гэтым — галоўная асаблівасьць нашага артыста, сакрэт яго ачараваньня... Артыст задзіўляе вялікай шырынёй сваіх песенных выяўленьняў. Мілагучна далікатны ў стрыманай, скромнай лірыцы, яго тэнар вытрымлівае аднолькава лёгка найвышэйшае напружаньне драматызму. Гэтую драматычную сілу яго голасу паказала ўва ўсім блеску выкананая ім арыя Фэдэрыко з опэры „Арлезіана" італьянскага кампазытара Чылеа. Гэта адна з найтруднейшых арыяў тэнаровага рэпэртуару. Аднэй гэтай арыі было-б даволі для прысуджэньня сьпеваку найвышэйшай рангі майстра-мастака. Далей аўтар рэцэнзіі піша аб тым, што наш сьпявак аднолькава дасканала пяе творы кампазытараў розных народаў — італьянскія, як прыродны італьянец, польскія—лепш, як найлепшыя польскія артысты, творы расейскай музыкі—яшчэ лепш. Але-ж найвялікшай дасканальнасьці дасягае наш мастак-

---

*) Крэмона — места ў паўночнай Італіі, якое ўславілася ў свой час знамянітымі скрыпкамі, што адзначаліся дасканалай чысьцінёй тону, якія цяпер цэняцца — „на вагу золата".

беларус, зразумела-ж, — у выкананьні **твораў родных беларускіх мастакоў — новых беларускіх кампазытараў, а перадусім найвялікшага з іх тварца — самога беларускага народу — у яго песьні.**

У гэтай галіне выкананьне Забэйды-Суміцкага, піша п. Сіріус, зьяўляецца ўжо запраўднай рэвэляцыяй: беларускую народную песьню уздымае ён на вышыню, якая ня сьнілася ні яе тварцу-народу, ні яе навейшаму мастаку-гарманізатару. І трэба добра ацаніць асабістую шляхотнасьць артыста, які родную сваю песьню моцна трымае ў сваім сэрцы і нясе яе з сабой і на польскую і далей на эўрапэйскую эстраду, ня гледзячы ні на якія перашкоды, перад якімі так лёгка адступаюць нашыя слабшыя духам „італьянцы"... З усяго сэрца, зразумела-ж, і мы далучымся да тых слоў, якімі канчае гр. Сіріус сваю рэцэнзію:

„Чэсьць і хвала рыцарскаму сэрцу і духу мастака за гэта— ў дадатак да нашай удзячнасьці яму за тую сапраўдную радасьць мастацтва, якой ён так шчодра абдарыў нас на сваім канцэрце".

Калі так пісаў крытык у расейскай прэсе, дык можна сабе лёгка ўцяміць, якое ўражаньне зрабілі канцэрты нашага мастака **ў беларускім** грамадзянстве. Яго канцэрт на карысьць Беларускага Студэнцкага Саюзу сабраў, можна сказаць, усё беларускае грамадзянства места. Асабліва горача і бурна рэагавала на нячуваныя ўражаньні нашая моладзь, якая літаральна засыпала сьпевака кветкамі.

Забэйда-Суміцкі назаўсёды здабыў для тябе сэрца нашага грамадзянства, з свайго боку, аддаўшы і сваё сэрца яму. Трэба думаць, што сувязь гэта ўжо не парвецца. Нажаль, толькі спробы выступленьняў нашага мастака ў іншых местах нашага Краю спатыкаюцца з перашкодамі. Пасьля Вільні ён выступаў у Беластоку, але там з вялікім трудом здабыты быў дазвол на ўключэньне ў рэпэртуар канцэрту... беларускіх нумароў, ня кажучы ўжо аб расейскіх — гэтыя былі адсечаны безапэляцыйна...

Падсумоўваючы ўсё, што сказана вышэй, трэба сказаць, што з усіх трох, здабыўшых сабе ўжо шырокі разгалос нашых мастакоў-выканаўцаў вокальнай музыкі, найбольшае значэньне мае **для разьвіцьця нашай беларускай справы** якраз М. Забэйда-Суміцкі. А гэта таму, што ён адзіны з іх усіх з поўняй шляхотнага самапаважаньня не адракаецца ад сваей Маткі-Зямлі, ад свайго Бацькі-Народу, ад сваей радзімай душы, ад свайго роднага духу.

Але яшчэ больш бадай тое, што **з гэтай сваей беларускай душой, не адракаючыся ад яе, наш артыст стаў на роўні з найвышэйшай музыкальнай культурай сьвету, прыняты ў яе лона, як роўны з роўнымі і вольны з вольнымі...** А гэта з усей пераконываючай сілай жывога нагляднага прыкладу— кажа аб тым, што запраўды-ж, як кажа наш Купала, — **Беларусь заняла ўжо свой пачэсны пасад між народамі, у даным выпадку—у разгледжанай намі тутака галіне—музыкі.**

І на гэтым шляху — шырокае і доўгае поле перад беларускім музыкальным геніем — дзеля **новага, арыгінальнага, творчага ўкладу ў скарбніцу сусьветнай музыкальнай культуры.**

Кажучы аб выхадзе ў сьвет беларускай песьні, ня можна абмінуць моўчкі віленскага беларускага хору **Р. Р. Шырмы**, які шмат папрацаваў якраз над гэтай, запраўды-ж дарагой яго сэрцу, справай. Бо-ж мала сказаць, што ён — уталентаваны дырыжор, які падняў на мастацкую вышыню свой хор, паставіў яго на роўні з найлепшымі хорамі ў краі. Справа ня толькі ў гэтым, але ў тым, што гр. Шырма наагул укладае ўсю душу ў любімую справу, якая сталася для яго справай усяго яго жыцьця. А таму ён — ня толькі дырыгуе хорам, выконываючы гатовыя песьні. Не. Ён сам шукае гэтых кветак на народнай ніве, ён зьбірае гэтыя краскі песьнятворчай душы Беларуса, запісывае іх. Ён шукае найлепшых мастакоў-кампазытараў, запалівае іх сваім агнём, заахвочывае іх да працы над простымі, але цудоўнымі ў сваей прастаце творамі народнымі, каб — з помаччу іх таленту, іх высокай музычнай культуры, — выдабыць з гэтых твораў, выявіць усю іх красу, стварыць новую галіну, новы абшар у сусьветнай музыцы — **абшар беларускі...**

Гэта-ж ён, Рыгор Раманавіч Шырма, „знайшоў" для нашай забытай і пагарджанай песьні слаўнага мастака Грэчанінава, гэта-ж ён запаліў яго, заразіў сваім полымем... Гэта-ж ён усьцяж „жывіць" і яго і К. М. Галкоўскага, Казуру і іншых мастакоў усё новымі і новымі творамі беларускай песьнятворчай душы, бясспынна падтрымліваючы ў іх заінтэрэсаваньне дарагой яму справай. Р. Р. Шырма — найлепшы знаўца беларускага песеннага фолькльёру на беларускім захадзе. Ён піша аб беларускай песьні, ён выдае сваім коштам, адбіраючы хлеб ад сваей сям'і, зборнікі беларускіх песьняў, ён зьбірае грошы на выданьне іх заграніцай і т. д.

Хор Шырмы мае ўжо сталую апінію ня толькі ў Вільні, але ведамы — праз Польскае Радыё — на ўсю Польшчу. Трэба падчыркнуць, як гэта робіць віленская крытыка, што хор яго не стаіць на месцы, на дасягненым ужо й высокім роўні. Ён усьцяж ідзе наперад, усьцяж дасканаліцца, пашырае свой рэпэртуар, павялічывае свае дасягненьні.

Беларускае грамадзянства павінна добра ўцяміць сабе, якое багацьце яно мае ў гэтым хоры, і далажыць усіх стараньняў, каб праца Шырмы давала найбольшыя рэзультаты. А тады наша багацьце будуць цаніць па ўсей яго запраўднай вартасьці і ўсе іншыя.

М. С.

На віленскіх эстрадах

Мінулы вясеньні канцэртны сэзон у Вільні быў вельмі багаты.

На самым пачатку сэзону адбылася ўрачыстая жалобная акадэмія ў чэсьць перадчасна памёршага ведамага польскага кампазытара Караля Шыманоўскага. Акадэмію ладзіла аб'еднаньне польскіх артыстычных т-ваў у Вільні 21 красавіка ў залі Віленскага Радыё. У праграме было ўступное слова праф. Гурскага, старшыні сходу, і даклады: гр. З. Мыцельскага — „К. Шыманоўскі на фоне эўрапэйскай музыкі", гр. Ст. Вэнслаўскага — „Шыманоўскі і польская музыка" і праф. Т. Шэлігоўскага — „Кароль Шыманоўскі ў Вільні". Музычнай ілюстрацыяй да Акадэміі былі: сымфанічная аркестра пад кіраўніцтвам гр. Левіцкага, раяль — В. Троцкі і солё-сьпевы вучаніц віленскай консэрваторыі. Аркестра і солёвыя выступленьні на раялю стаялі на запраўднай вышыні музычнай культуры, іх прыемна было слухаць. Затое сьпевы абсалютна нічым не выяўлялі характэрных асаблівасьцяў таленту такога вялікага кампазытара, як Шыманоўскі. Паводле дакладчыкаў, Шыманоўскі — вялікая фігура ў музычным сьвеце ня толькі польскім, але і эўрапэйскім, — а салісткі, здавалася, мелі сваім заданьнем паставіць яго на апошнім месцы нават польскага музычнага алімпу: ня можна было зразумець ні характару мэлёдыяў, ні тых тэкстаў, да якіх яны напісаны. Такія сьпевы залічыць да ўдачных ня можна.

8 траўня адбыўся гадавы канцэрт у літоўскай гімназіі, на якім выкананы былі творы кампазытара К. Галкоўскага на літоўскія народныя тэмы для балету, сьпеву і солёвых інструмэнтаў. Вечар, душою катарага быў сам кампазытар, пакінуў самае глыбокае і сымпатычнае ўражаньне. Усе яго творы, якія складалі праграму вечара, яскрава падчырківалі, што перад публікаю ня толькі вялікі знаўца музыкі і прафэсар, але разам і вялікі мастацкі талент.

22 траўня адбыўся ў залі б. консэрваторыі канцэрт хору Я. Герштэйна пры т-ве прыяцеляў жыдоўскай гімназіі ў Вільні. Гэты хор мае каля 100 асоб, пераважна з работніцкай моладзі. Працуе ў сваей сьпявацкай студыі над сваім дасканаленьнем зімою і летам, пробы адбываюцца вечарамі пасьля працы тры разы на тыдзень. Кожнае выступленьне хору карыстаецца нязвычайным пасьпехам. На гэтым канцэрце для нас асабліва прыемна было чуць у перакладзе на жыдоўскую мову паэта Когана тры беларускія народныя песьні: „Вярба" — Сьвешнікава, „Бяда" — Уладзімірскага і „Зялёны гай" — Грэчанінава. Уражаньне было як найлепшае. Дзьве першыя песьні сымпатычнаму рэгенту прыйшлося на дамаганьне публікі адсьпяваць на біс.

4 траўня і 2 чэрвеня адбыліся канцэрты Паўла Пракапені. Малады сьпявак мае сьвежы і сільны голас, відаць музычная школа, але ёсьць да гэтага і заганы. Адна з іх і самая вялікая — надужваньне стыхіяй свайго голасу, для бісавых эфэктаў. Праўда, гэта ў Пракапені чужое, наноснае, зусім непатрэбнае. Чым хутчэй ён пазбавіцца ад такіх прыёмаў сьпеву, тым хутчэй знойдзе сам сябе, стане на ўласныя ногі, здабудзе публіку і без пасярэднікаў. Найлепшыя нумары ў яго праграме — „Бурлакі" і „Два гренад'еры" — узяты з Шаляпінскага рэпэртуару. Відаць, што малады артыст шукае сваіх шляхоў. Толькі пры гэтым ён павінен зразумець ня толькі розумам, але ўсёй істотай, што

> Над вольнай мысьлью Богу неугодны
> Насилие і гнет.

Гэтая глыбокая праўда знаходзіць застасаваньне і да мастацтва наагул, асабліва-ж такога, як сьпеў і музыка. Вось тады ўжо можна будзе без агаворак сказаць: Пракапеня — гэта артыст з Божае ласкі.

10 траўня адведаў Вільню Шаляпін. На канцэрт яго сабралася і запоўніла гарадзкую залю на Астрабрамскай віленская публіка бяз розьніцы нацыянальнасьці. Вялікі артыст ужо падсумоўвае вынікі сваей кар'еры. Але з першым выхадам на эстраду чуецца геній, роўнага катораму яшчэ ня знае сусьветная сцэна. На звычайным канцэрце гэты артыст ня толькі пяе, ён малюе. Лёгкім рухам, выражэньнем твару ён дае абразы таго, аб чым расказвае сваім голасам. Калі пяе „Ночной смотр", здаецца жывы Напалеон ідзець перад фронтам, залажыўшы руку за камізэльку. Вы бачыце спаленых сонцам, замучаных працаю з лямкаю на плечах бурлакоў, калі ён пяе пра Волгу і адчуваеце гістарычную праўду аб царскай Расеі з першых слоў гумарыстычнай песенькі пра „титулярнаго советника" і „генеральскую дочь". Віхрам воплескаў адказвае заля на яго плясовую — „Вдоль по Питерской". Шаляпін — гэта Расея — шырокая, магутная...

16 і 27 траўня былі два канцэрты М. Забэйды-Суміцкага (аб гэтых канцэртах падаём справаздачу на іншым месцы — рэд). Артыст паказаў ня толькі беларускую песьню ў мастацкім выкананьні — палякі называлі на канцэрце яе „perełkami", — ён і польскую паказаў такою, якою мы яе дагэтуль яшчэ ня бачылі. „Wiosenne rano" — Маліноўскага, „Na ust korali" — Марчэўскага, „Zasmuconej" — Карловіча поўнасьцю сьціралі нацыянальную розьніцу паміж слухачамі, парывалі ўсіх і змушалі дамагацца паўтарэньня.

Р. Шырма



Міхась Васілёк—**З сялянскіх ніў.** Вільня, 1937. Бач. 29, нлб. 1. Ф. 8°

Пунсавыя хварбы паказаўшыся ў вершах Васілька ў зборніку *З сялянскіх ніў* сыгналізуюць аб паважнай эвалюцыі, зайшоўшай у творстве паэта. Сьведчаць аб пераацэнцы вартасьцяў, так і аб тым, што мастацкая палітра Васілька ўзбагацілася новымі сродкамі экспрэсіі.

Пераацэнка вартасьцяў прымусіла яго адкінуць старую мэту вершатварэньня мінулых паэтаў: — выкліканьне спачуцьця да бедных і гаротных Беларусаў. І апошні зборнік Васілька ёсьць дакумэнтам, сьцьвярджаючым, што беспаваротна скончана з пэрыядам, калі беларускі пясьняр што трэці верш мог пачынаць ад слоў: „Ах ты, доля мая, доля" і г. д. Таксама варта ўвагі, што „вясковай раніцы пунсовы сьмех", як і іншыя даволі маляўнічыя эпітэты, выдатна адсьвяжаюць вясковую тэматыку аўтара, робячы яе больш атракцыйнай.

Калі *Шум баравы,* будучы, у сваю чаргу, вельмі сымпатычным зьявішчам, ня ўносіў амаль нічога новага (пакрываўся з тым, што пакінулі Цётка, Сваяк і інш.) у заходне-беларускую літаратуру, — *З сялянскіх ніў* прыносіць вязанку сьмелай, суадказна з духам часу створанай, арыгінальнай, сказаў-бы модэрністычнай паэзіі.

Наагул Васілёк — гэта паэт лініі падзелу. Лінія падзелу, каторая ў сяньняшні час пераразае цэлы глёбус, каторая найярчэй зарысавалася там, пад Більбао, пад Каза дэль Кампо, праходзіць і праз нашу Краіну. Мастацкае адбіцьцё гэтага змаганьня знаходзім у творах Васілька. У адчуваньні і адмалёўваньні гэтага змаганьня ён аказаўся на тым-жа баку лініі падзелу, на каторым знаходзяцца Тамаш Манн, Ромэн Ролян, Карл Осецкі і іншыя волаты эўрапэйскага слова і сумленьня. Выражае свае пачуцьці паэт беспасярэдна і імпульсыўна — таму тым болей ягоныя „з сялянскіх ніў жывыя адгалосы" ёсьць цэнным укладам у беларускую анталёгію.

Нажаль у зборніку „З сялянскіх ніў" аўтар не пазбыўся нотак нэрвовасьці, знаёмых яшчэ з „Шуму Баравога". Косы паўдзённага сонца і марскія хвалі далі-б, здаецца, тутака пажаданыя вынікі.. Але ці даюць дазвол на гэта жыцьцёвыя сучасныя ўмовы?

У кожным выпадку, трэба спадзявацца, што пунсавыя хварбы ў творстве Васілька перамогуць.

А. Б—скі.

В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі і Д. І. Даўгяла. **Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах.** Том І. (IX—XVIII ст.) Фармат 8°, бач. XVI+678, нлб. 2. Выдавецтва Акадэміі Навук БССР. Менск 1936.

Праца пад названым загалоўкам, якую злажылі акадэмік В. К. Шчарбакоў, дацэнт К. І. Кернажыцкі і археограф Д. І. Даўгяла, зьяўляецца паважнай пазыцыяй у беларускім савецкім друку. Як можна думаць із зьмешчаных у прадмове да яе энунцыяцыяў, паўстала праца, як рэзультат нездавальняючага стану ў разьвіцьці гістарычнай навукі і адукацыі ў СССР агулам, у Беларускай ССР у асобнасьці, і як вынік датарнаваньня да выдадзеных ў 1934 г. цэнтральнымі кіруючымі ўрадавымі і партыйнымі органамі ўлады СССР пастаноў і дырэктыў аб перабудове навукова-дасьледчай работы ў галіне гісторыі і выкладаньня гэтай гісторыі ў школах СССР.

Афіцыяльныя савецкія дзейнікі сьцьвярджаюць, што ў гістарычнай навуцы і ў яе некаторых творцоў-гісторыкаў, перад выданьнем гэных рашэньняў і дырэктываў, праяўляліся „шкодніцкія тэндэнцыі і спробы ліквідацыі гісторыі, як навукі"... (гістарычная школа Пакроўскага, група Ванага), апрацаваньне гістарычнага матарыялу ў навуковых працах, падручніках было нязгодным з марксыцкай мэтадолёгіяй, дзеля чаго яно было абстрактным, схэматычным, пры гэтым праяўлялася пагарда да фактычнага, канкрэтнага гістарычнага матарыялу, і побач з гэтым пагарда да гісторыі народаў СССР — апрацоўвалася руская гісторыя а не гісторыя народаў СССР (беларускага, украінскага і інш.).

У Савецкай Беларусі, міма надзвычайна вялікага зацікаўленьня масаў да сваей гісторыі, міма патрабаваньняў на літаратуру з гісторыі Беларусі з боку вучняў, настаўнікаў, студэнцтва гістарычных вышэйшых навучальных устаноў, а так-жа міма патрабаваньняў на дакумэнты, матарыялы, кніжкі з гісторыі Беларусі з боку аўтараў падручнікаў аб гісторыі народаў СССР, — беларуская гістарычная літаратура прадстаўляецца вельмі скромна, пры чым і гэтая літаратура мае недахопы — ў большасьці яна мае ў сабе той-жа схэматызм Пакроўскага і многіх іншых гісторыкаў, недахопы мэтадолёгічнага характару, як і той недахоп, што не асвоіла таго вялікага, так патрэбнага гісторыкам, фактычнага матарыялу, які знаходзіцца ў архівах.

Выправіць такі ненармальны стан у адносінах да беларускай гістарычнай справы ўзялі за сваё заданьне між іншымі гісторыкамі ў Савецкай Беларусі і ўспомненыя складальнікі „Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах", якой першы том паказаўся ў друкаванай вопратцы, а другі том, падрыхтаваны акадэмікам В. Шчарбаковым, К. Кернажыцкім і Д. Дутковым, такога самага абыйма, як і першы, як даведываемся з прадмовы да першага тому, ужо зданы ў друк і ахапляе пэрыяд з канца XVIII да канца XIX стагодзьдзя. Ці будзе надрукаваны гэты другі том, сказаць

напэўна ня можна, хоцьбы дзеля таго, што два першыя яго складальнікі (Шчарбакоў, Кернажыцкі), згодна з паведамленьнем менскай прэсы з пачатку ліпня сёлета, аказаліся ...„ворагамі народу“!

Першы том „Гісторыі Беларусі ў дакументах і матарыялах“ ня ёсьць навуковым эляборатам, не зьмяшчае разважаньняў аб фактах з гісторыі Беларусі і іхнымі прычыннымі адносінамі, — заданьнем яго, як сказана ў прадмове — „даць... гісторыкам, студэнтам гістарычных факультэтаў і выкладчыкам-гісторыкам дапаможнік з гісторыі Беларусі, узброіць іх адпаведным фактычным матарыялам, падабраўшы гэты матарыял па асноўных пытаньнях гісторыі Беларусі эпохі фэадалізму“. Далей тут-жа сказана: „Сабраны і адпаведным чынам скампанаваны дакумэнтальны матарыял для гэтага першага тому зьяўляецца надзвычайна вялікім і ў значнай меры задаволіць тых, хто працуе над пытаньнямі гісторыі“.

Трэба прызнаць, што гэтае заданьне складальнікамі сумленна выканана. Падабраны матарыял зьмяшчае 396 дакумэнтаў— вытрымкі з летапісаў, нямецкіх, лацінскіх і польскіх хронік, дакумэнты з Літоўскай мэтрыкі — гэтай найбагацейшай крыніцы гістарычнай веды аб Беларусі ў мінуўшчыне, — старасьвецкія граматы, прывілеі, законадаўчыя акты і інш. Увесь падабраны матарыял разьмешчаны ў дванаццацёх разьдзелах, у кожным з іх у хранолёгічным парадку, пры гэтым разьдзелы маюць загалоўкі, якія зьяўляюцца ня чым іншым, як адноснымі і важнымі пытаньнямі з гісторыі Беларусі. Вось гэтыя разьдзелы: I. Нараджэньне фэадалізму ў Беларусі (IX—XIII ст.), (бач. 1—51); II. Утварэньне вялікага княства літоўскага на тэрыторыі Літвы і Беларусі (52—91), III. Феадальная гаспадарка і рост буйнага землеўладаньня (92—136); IV. Становішча сялянства і масавае яго запрыгоненьне (137—209); V. Пануючая кляса, яго правы і прывілеі (210—252); VI. Феадальныя войны і групавая барацьба феадалаў (253—304); VII. Феадальны горад, гандаль і рамяство (305—397); VIII. Феадальная дзяржава ў Літве і Беларусі ў канцы XV і XVI ст. (398—436); IX. Зьнешняя палітыка феадальнай дзяржавы (437—460); X. Сялянскія і казацкія рухі ў XVI—XVIII ст. (461—526), XI. Феадальная культура і рэлігія (527—560); XII. Беларусь у складзе Рэчыпаспалітай (561—645). У канцы ў працу ўключаны геаграфічны і асабовы паказчыкі і таксама паясьняльны слоўнік незразумелых слоў.

З гледзішча археографічнага надрукаваны матарыял зьяўляецца ў большасьці перадрукам з гістарычных крыніц, якія дакладна паказаны ў асобным бібліёграфічным дадатку. З палеаграфічнай стараны, — некаторыя палеаграфічныя асаблівасьці незахаваны — складальнікі жадаючы даць палёгку чытачу ў чытаньні надзвычайна рознастайных па сваей транскрыпцыі крыніц, палеаграфічны тэкст упросьцілі, выкідаючы нікаторыя літары, нікаторыя з іх замянаючы, або перадаючы роўназначнымі.

Апрача перадрукаў, ёсьць паданы матарыял у перакладах з лацінскай і польскай моваў на беларускую, а таксама перадрукі перакладаў на рускай мове, наколькі арыгіналы самых тэкстаў ня былі складальнікам даступны.

Беларуская мова першага тому „Гісторыі Беларусі ў дакументах і матэрыялах“, як відаць ужо нават з загалоўку, засьмечана русыцызмамі — ў слове, морфолёгіі, сынтаксе і правапісу.

Як ужо сказана на пачатку, праца гэтая зьяўляецца вартаснай і паважнай пазыцыяй у беларускім савецкім друку і ў значнай меры выпаўняе прабелы ў беларускай гістарычнай літаратуры.

Я. Ш.

Lietuviu Tauta. *Lietuviu Mokslo Draugijos Raštai.* V knyga. Vilniuje, 1936. Бач. 264.

Гэта непэрыядычнае выданьне Віленскага Літоўскага Навуковага Таварыства. Зьмест наступны:

1. Аўтобіографія др. Іонаса Басанавічіаса. Займае яна 165 бачын. Спатыкаем тут вычэрпываючыя і цікавыя весткі аб жыцьці і дзейнасьці патрыярха адраджэньня Літоўскага Народу.

2. Праца кун. Ф. Няверы аб францішканах абсэрвантах у нашым краі да часу стварэньня першай правінцыі. Пішучы аб францішканах у Полацку, аўтар закранае так-жа й нашага слаўнага доктара Францішка Скарыну, залічаючы яго за Ловмяньскім (Ateneum Wileńskie, 1925) да каталікоў. Тымчасам справа яго веравызнаньня да сяньня ёсьць навырашанай.

3. Кун. др. А. Віскантас памяшчае так-жа значную працу аб Канцлеры Вял. Кн. Літ. Льве Сапезе. На ўвагу заслужвае тут сумленнае выкарыстаньне аўтарам багатай аб ім літаратуры. Гэта можа быць не аднаму карысным, хто далей будзе студыяваць аб слаўным канцлеры.

4. Артыкул праф. Э. Фрэнкеля аб асаблівасьцях гутарак літоўскай мовы Віленшчыны.

5. Артыкул М. Унтуліса аб саславяншчаньні літоўскіх назоваў мясцоў. Гутарка тут аб зьбеларушчаньні розных літоўскіх мясцовасьцяў, з якіх аўтар вылічае далёка ня ўсе.

Урэшце йдзе багаты аддзел „Miscellanea“, якім і канчаецца гэтая пятая кніга: „Lietuviu Tauta“.

Mykalas Biržiška: **čečeta, čapskiai, čackiai, čartoriskiai.** Kaunas 1936.

Ёсьць гэта адбіткі артыкулаў з Літоўскай Энцыклёпэдыі, якая выходзіць у Коўне, аб родзе Чэчатаў, Чапскіх, Чацкіх і Чарторыскіх. Для беларусаў на асаблівую ўвагу заслужваюць адбіткі аб Чэчатах і аб Чацкіх, дзе можна знайсьці бадай вычэрпываючы матарыял аб гэтых родах, сярод каторых — асабліва сярод Чэчатаў (Ян Чэчат) — былі асобы, якія зьвязаны і з беларускай літаратурай і культурай. *Ад. Ст.*

ХРОНІКА

— 25 мая сёлета прыпадалі дваццатыя ўгодкі сьмерці вядомага беларускага паэта Максіма Багдановіча, які памёр на сухоты ў Ялце ў 1917 г., маючы ўсяго 26 гадоў. З гэтае прычыны студэнцкае Таварыства Прыяцеляў Беларусаведы пры віленскім унівэрсытэце наладзіла 30 мая урачысты вечар, прысьвечаны памяці песьняра. На вечары прачытаў гр. Антон Луцкевіч рэфэрат п. н. „Максім Багдановіч і ягонае творчасьць.“ Рэфэрат быў пераплятаны рэцытацыяй цікавейшых вершаў Багдановіча.

— Беларускі Тэатральны Каапэратыў „Полымя“ 6 чэрвеня зладзіў у Беластоку канцэрт М. Забэйды-Суміцкага. Артысту акомпаньяваў ведамы прафэсар Урштэйн з Варшавы.

— Кампазытар К. Галкоўскі апрацаваў шэсьць народных беларускіх песень для аднаго голасу з акампаньямэнтам фортэп'яну. Мэлёдыі і тэксты песень, узятыя з рукапісаў Р. Шырмы, запісаны: дзьве у вёсцы Кацёлкі, Пружанскага павету — „Ой дожджык ідзе, раса нападзе“ (восень) і „Ой у полі дзьве пташачкі. обе рабакрылы“ (ракруцкая), адна у м-ку Мядзёл, Пастаўскага павету — „Кукавала зязюлька, што лес мал“ (вясельная, жартаўлівая), адна у в. Нізяны, Ваўкавыскага павету — „На гарэ камары, а ў даліні гусі“ (гумарыстычная), адна ў в. Навасёлкі, Паст. п. — „Купалялё,“ і „Чэраз садвінаград па ваду хадзіла“ — прыпеўкі з Наваградчыны. Гэтыя новыя працы слаўнага кампазытара зьяўляюцца вельмі цэнным укладам у беларускую вокальную літаратуру, асабліва солёвую. Распрацаваны з нязвычайным майстэрствам вялікага мастака, з поўным разуменьнем народнага духу і захаваньнем народнага стылю і характару, прычым адна з гэтых песень паложана так-жа для віялянчэлі і раяля.

— 18-га траўня адбылося паседжаньне Літаратурна-Мастацкае Сэкцыі Беларускага Навуковага Т-ва ў Вільні з учасьцем пачэснага госьця беларускага артыста-пяюна Міхала Забэйды-Суміцкага і некаторых прадстаўнікоў віленскага артыстычнага сьвету. На парадку дня быў даклад гр. А. Луцкевіча на тэму аб значэньні для беларускага адраджэньня такіх культурных фактаў, як беларускія здабычы ў галінах навукі, паэзіі, мастацтва. Галоўнай думкай рэфэрату было сцьвярджэньне таго, што беларусы ўжо даўно выйшлі із стану „этнографічнага матарыялу“ і з об'екту чужацкіх уплываў сталіся суб'ектам, самастойным тварцом культуры і красы ў сям'і народаў сьвету. Гр. Забэйда-Суміцкі прапяяў некалькі беларускіх песень.

— Экспонаты Беларускага Музэю на выстаўках у Варшаве і Вільні. Беларускі Музэй ім. Ів. Луцкевіча на запросіны І. Р. S. (Інстытуту Пропаганды Мастацтва) згадзіўся прыняць учасьце ў ладжанай у Варшаве агульнапольскай выстаўцы народнага мастацтва (ліпень-верасень) і пасланць на яе свае экспонаты: народную разьбу, народнае малярства і народныя дрэварыты. Высланы ў Варшаву тры скрыні экспонатаў.

Адначасна Беларускі Музэй даў сваіх 18 экспонатаў (абразы, разьба, дрэварыты, гафты) на зладжаную ў Вільні ад 29.VI да 6.VII „Марыолёгічную выстаўку“ (выстаўку адбіцьця ў мастацтве культу Маці Божае). Выстаўка была зладжана ў сувязі з Марыянскім Кангрэсам Віленскае Архідыэцэзіі — пры касьцеле сьв. Духа.

— Беларускі Музэй у апошніх часох набыў каля соткі манэт В. Кн. Літоўскага з XV і XVI ст. ст., земскую пячаць Наваградзкага ваяводзтва з 1765 г. і рад іншых цікавых экспонатаў.

— У касьцеле у Гудагаях (каля Вільні) знайдзены цэнны забытак беларускага малярства ў постаці абраза Мадонны (Маці Божай). Абраз маляваны на дубовай дошцы, разьмеру разложанага аркушу паперы. Паводле дасюлешніх дасьледаваньняў, абраз паходзіць з 15-га стагодзьдзя.

— Унівэрсытэцкая бібліотэка ў Коўне (кіраўнік праф. Вацлаў Біржышка) 10.IV.37 аддала беларускім студэнтам, што вучацца ў ковенскім унівэрсытэце, 15 тысяч экзэмпляраў розных беларускіх кніжак.

Гэтыя кніжкі выдала ў сваім часе Беларускае Выдавецтва, якое было зарганізавана пры міністэрстве беларускіх спраў. Пасьля ліквідацыі міністэрства, кніжкі апынуліся ў літоўскім міністэрстве загранічных спраў, якое некалькі год таму назад перадало іх унівэрсытэцкай бібліотэцы.

Беларускія студэнты аддалі кніжкі Беларускаму Нацыянальнаму Камітэту ў Коўне, дзеля безграшовай перадачы іх беларускім арганізацыям і паасобным Беларусам у Літве.

— 9 траўня сёлета Беларусы ў Дзьвінску адзначылі г. зв. „Дзень маці.“ У памешканьні II Дзьвінскай дзяржаўнай гімназіі, пры якой мецца невялічкі беларускі камплект, былым дырэктарам былай Дзьвінскай беларускай гімназіі С. П. Сахаравым быў прачытаны рэфэрат на тэму „Маці і сялянка,“ у якім ён адзначыў ролю маці ў нацыянальным жыцьці кожнага народу, у тым ліку і беларускага.

Пасьля рэфэрату былая кіраўніца Дзьвінскае беларускае пачатк. школы С. С. Карнавухава-Саўкант прадэклямавала паэтычны абразок „Любоў Маці.“

На заканчэньне вучні беларускага камплекту прадэклямавалі некалькі беларускіх вершаў, а беларускі хор пад кіраўніцтвам матурыста Дзьвінскае белар. гімназіі Пятра Заліўскага стройна выканаў некалькі беларускіх песень.

Сьвяткаваньне „Дня маці“ зрабіла на ўсіх добрае уражаньне.

Гэта было ужо другое выступленьне ў бягучым годзе Беларусаў у Дзьвінску.

Першае было 16 студня, калі беларускі хор прыняў удзел у канцэрце ўсіх нацыянальнасьцяў места Дзьвінску.

— Новая беларуская опэра. Беларускі савецкі пісьменьнік Пятрусь Броўка напісаў лібрэтто новай беларускай опэры. Дзея опэры адбываецца на фоне сусьветнай і грамадзянскай вайны. У лібрэтто выкарыстана шмат фольклёрнага матарыялу. Музыку опэры піша кампазытар Е. Цікоцкі. Ставіць опэру будзе Беларускі тэатр опэры і балету. 18 траўня адбылося ў Менску, зарганізаванае Кіраўніцтвам справамі мастацтваў пры СНК БССР, паседжаньне, з учасьцем рэжысараў, артыстаў тэатру опэры і балету, паэтаў, пісьменьнікаў і кампазытараў, на якім было прачытана лібрэтто. Лібрэтто атрымала ацэну, як твору вялікай вартасьці.

— Дня 27, 29 чэрвеня і 1-га ліпня менскае радыё надавала канцэрты дзеля паказу творчасьці кампазытараў Сав. Беларусі. У праграму канцэртаў уходзілі творы Самохіна, Скерца, Пукста, Цікоцкага, Аладава, Залатарова, Тэраўскага. Першы раз была выканана „Фантазія на беларускія народныя тэмы“ Туранкова.

— У восені ў Менску адбудзецца выстаўка народнай творчасьці, на якой будуць паказаны малюнкі, жывапіс, скульптура, мастацкая вышыўка, разьба, мазаіка, цэраміка, ткацтва, цацкі і т. д.

— На ўсходнім рубяжы этнаграфічнай Беларусі, каля места Бранска (цяпер Орджанікідзэгорад), на ўзвышшы левага берагу ракі Дзясны, на плошчы каля 2000 квадратных мэтраў адбываюцца экспэдыцыяй смаленскага гістарычнага музэю пад кіраўніцтвам дырэктара музэю Е. І. Каліцінай і пры ўчасьці археолёгаў Е. І. Гадунцовай (Масква), Кавалені (Акадэмія Навук БССР) і мясцовых краезнаўцаў — раскопкі старадаўнага (прыблізна з III—VIII в. па Нарадж. Хрыста) гарадзішча. Выкапаны жыльлёвыя зямлянкі ці поўзямлянкі, астаткі старадаўных печаў дляператопліваньня мясцовай жалезнай руды, а таксама жалезныя прадметы — нажы, наканечнікі стрэлаў і інш. Гэта паказывае на існаваньне ў тым часе жалезнай прамысловасьці. Апрача таго, існавала і медзяная прамысловасьць, на што па-

казываюць знайдзеныя маленькія формачкі для ліцьця з бронзы шпілек, бранзалетак і інш. прадметаў упрыгажэньня. Медзі, як ведама, ў гэтай мясцовасьці нямашака. Для прамысловых мэтаў яе прывозілі сюды з Паўдзённай Украіны ці з краін Зах. Эўропы, і гэта сьведчыць аб разьвіцьці ў тым часе абмену.

У вялікай колькасьці знайдзены косьці дзікай жывёлы — лася, мядзьведзя, бабра, лісіцы, і хатняй—каня, быка, сабакі, што сьведчыць аб разьвіцьці ў тым часе паляваньня і земляробства.

Вельмі многа знайдзена чарапкоў глінянай пасуды (ручной работы), а таксама гліняных круглячкоў, што служылі грузіламі для рыбацкіх сетак.

Раскопкі даюць цікавы і багаты для навукі матарыял.

— Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдала ў гэтым годзе, у беларускай мове, наступныя кнігі. Беларускіх пісьменьнікаў — вершы: М. Хведаровіч — „Усім сэрцам," проза: Міхась Лынькоў – „Янка парашутыст" (аповесьць для дзяцей), Андрэй Лятун" (у новым выданьні) А. Якімовіч—„Залаты зуб" (зборнік апавяданьняў), Ю. Віцьбіч—„Формула супрацiўленьня касьцей." Пераклады: Сейфуліна — „Тося," О. Бальзак — "Гобсек," Н. С. Лескоў — Тупейны мастак," А. П. Чэхаў —„Спаць хочацца" і „Чалавек у футляры," А. С. Пушкін — „Станцыйны даглядчык" і „Мяцель," „Цыганы" (гэты твор пераклаў А.Куляшоў), „Каўказскі нявольнік"(перакл. М. Хведаровіч), выбраныя творы („Аповесьць Белкіна" і „Капітанская дачка"), М. Горкага — XVIII і XIX томы поўнага збору твораў Маякоўскага—паэма„Уладзімір Ільіч Ленін" (перакл. П. Броўка), М. Шолахава — трэцяе выданьне „Паднятай цаліны," Фурманава—„Чапаеў," Яноўскага—„Коньнікі," А.Глебава — „П'есы для самадзейнага тэатру," Лейцэна — „Лімітрофія" (апавяданьні, перакл. з літоўскай мовы), Новікава - Прыбой – „Жанчына ў моры," Тургенева — „Бацькі і дзеці," і іншыя.

З падручнікаў: Шэўчык і Саломенік — Граматыка беларускай мовы (морфолёгія і сынтаксіс).

Музычны сэктар ДВБ выдаў новыя творы беларускіх сав. кампазытараў: А. Туранкова — на словы Я. Купалы „Песьня кастрычніка," А. Багатырова — на словы Купалы „Сонцу," беларускія народныя песьні ў апрацоўцы Н. Аладава— „Нету цьвету пякнейшага," „Ой ці мне, вох," і ў апрацоўцы А. Багатырова — „Ляцела зязюля."

— Сёлета Акадэмія Навук БССР выдала „Руска-беларускі слоўнік." Рэдагаваў слоўнік паэт А. Александровіч. Слоўнік налічае 35 тысяч слоў. Тыраж — 20 тысяч экзэмпляраў.

—„Ворагі народу" Паводле менскай прэсы у лік „ворагаў народу" залічаны, апошнім часам, апроч многіх беларускіх сав. пісьменьнікаў, ведамыя літаратурныя крытыкі: праф. М. Піотуховіч, праф. Бранштэйн. Паводле той-жа прэсы ў Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце „ворагамі" аказаліся навуковыя працаўнікі: Дзякаў (камісар асьветы), Кучынскі, Каляда, Шчарбакоў, Успенскі, Афанасьеў, Ляўданскі, Пшанічны, Аляхновіч, Мухарджа, Поташ, Кернажыцкі, Бордакоў і інш.

У інстытуце аграглебазнаўства і ўгнаеньняў акадэміі навук БССР выкрыты, як„ворагі народу", дырэктар інстытуту Пратасеня і праф. Э. Магарам.

Усім гэтым асобам закідаецца нацыяналдэмакратызм і трацкізм



Рэдакцыйная Калегія: др. Ст. Грынкевіч, Ад. Станкевіч, М. Пяцюкевіч, А. Бярозка і Я. Шутовіч.

Рэдактар-выдавец: Ян Шутовіч.

Ад выдавецтва:

Кніжка 1 (10) „Калосьсе" за першы квартал 1937 г. віленскія адміністрацыйныя ўлады сканфіскавалі, дзеля чаго ня можам яе выслаць патрабуючым.